

ТРАДЫЦЫІ: ПАМІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫМ 9

САКРЭТЫ КОННАГА СПОРТУ 12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЛІСТАПАДА 2018 г. СУБОТА № 217 (28833)


**ЛІЧБА ДНЯ**

**49,5 млн тон**

*тавараў прайшло праз Беларусь у студзені — верасні 2018 года, што на 18 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, паведамілі ў Дзяржаўным мытным камітэце. З кожным годам павялічваюцца аб'ёмы транзіту расійскіх тавараў. За дзевяць месяцаў па тэрыторыі нашай краіны прайшло больш як 43 млн тон такіх тавараў, што на 20 % больш, чым за аналагічны перыяд 2017-га. Транзітны патэнцыял Беларусі пастаянна павялічваецца, у тым ліку і за кошт работы, накіраванай на паскарэнне праводзення мытных аперацый.*

## Позні дзікі мёд



Фота БелТА.

«Хатніх» пчол гаспадары ўжо адпраўляюць на зімовую спячку, а «дзікі» мёд з борцяў, што вісяць на дрэвах у лесе, збіраюць якраз у гэты час. Прынамсі, у Лельчыцкім раёне, дзе гэты старажытны промысел і сёння з'яўляецца традыцыйным для многіх палешукоў. Як, напрыклад, для жыхара аграгарадка Глушкавічы Васіля МАРКЕВІЧА, які мае зараз сорак уласных борцяў.

**КОРАТКА**

- Праект указа «Аб павышэнні энергаэфектыўнасці шматкватэрнага жыллёвага фонду» ўнесены ва ўрад.
- **Насельніцтва ў Беларусі ў 2019 годзе будзе кампенсаваць каля 20 % сабекошту цеплавой энергіі.**



- Касметыка і парфумерыя ў ЕАЭС будуць дадаткова тэсціравацца на раздражняльнае ўздзеянне.
- **Шэдэўры харавой оперной музыкі прагучаць у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета 14 лістапада.**
- У Гродзенскай вобласці ў студзені — кастрычніку зарэгістравана 162 выпадкі шаленства жывёл, што ў 3,2 раза больш, чым за аналагічны перыяд летась.

Не адходы, а рэсурс

## ГРОШЫ З ПУСТЫХ БУТЭЛЕК

### Хто сёння здае шклатару?

**«Некалі адна здадзеная бутэлька з-пад малака каштавала 15 капеек, а батон — 18. За капейку можна было купіць пачак запалак», — успамінае мінскі прыёмшчык шклатары. Сёння ж, каб сабраць на бохан хлеба, спатрэбіцца куды больш бутэлек. Колькі каштуе шкло з-пад напояў, чаму заводы не хочуць выкарыстоўваць упакоўку паўторна і што зменіцца са з'яўленнем у краіне тараматаў?**

**Ад школьніка да інтэлігента і выпівохі**

Будны дзень. Раніца. У прыёмны пункт на сталічнай вуліцы Бялінскага людзі падыходзяць кожныя 10 хвілін, а то і часцей. З мяхамі, заплечнікамі, чамаданамі, набітымі бутэлькамі.

— Я тут не вельмі часта бываю, не кожны дзень, — расказвае пенсіянер, які прывёз шкло на калясцы і ўжо паспеў атрымаць за яго грошы. — Сёння здаў дзесяць бутэлек — на 80 капеек. Бывала і тры, і чатыры рублі атрымліваў. Дзесяць рублёў за раз ніколі не выходзіла.

СТАР. 4

## ЧЫМ ПАГРАЖАЕ САМАЛЯЧЭННЕ?



**Не паспеў пачацца «прастудны» сезон, як нам ужо адусюль навязваюць рэкламу, чым і як трэба змагацца з вірусамі і інфекцыямі. Не дзіўна, што пры першых сімптомах мы бяжым у аптэку. Розныя прэпараты скупляюцца пачкамі, выпіваюцца тут жа за рабочым сталом. І сапраўды, праз некалькі хвілін ты адчуваеш сябе амаль што бадзёрым і амаль што здаровым. Праблема вырашана, лічым мы. Праблема толькі пачынаецца, папярэджвае намеснік галоўнага ўрача Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы Ірына МАЛЁВАНАЯ. Яна добра ведае, да чаго прыводзіць самалячэнне.**

СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# ПАДТРЫМАЦЬ СЛОВАМ І СПРАВАЙ

## У панядзелак у Беларусі стартуе Сусветны тыдзень прадпрымальніцтва

**У сувязі з гэтай падзеяй арганізатары сабралі прэс-канферэнцыю ў Нацыянальным прэс-цэнтры, на якой падрабязна расказалі аб усіх выстаўках і форумах на працягу сямі дзён. Нагадаем, Сусветны тыдзень прадпрымальніцтва — гэта штогадовае глабальнае мерапрыемства, якое аб'ядноўвае 170 краін у пошуку новых ідэй для прадпрымальніцтва ўсяго свету. Беларусь правядзе яго ўжо ў восьмы раз.**

Як адзначыла **намеснік дырэктара ТАА «Цэнтр дзелавых камунікацый «БелБіз» Анастасія ХАМЯНКОВА,** гэта падзея з'яўляецца важнай для нашай краіны, паколькі паказвае ролю прадпрымальнікаў у развіцці эканомікі дзяржавы — сюды ўваходзіць, напрыклад, і стварэнне працоўных месцаў. Дарэчы, сёлета мерапрыемства пройдзе пры падтрымцы Савета Міністраў і Міністэрства эканомікі Беларусі, у прыватнасці.

**Намеснік міністра эканомікі Беларусі Дзмітрый МАТУСЕВІЧ** расказаў, што падчас Сусветнага тыдня прадпрымальніцтва плануецца падпісаць праект эканамічнага развіцця Беларусі на мясцовым узроўні. Паводле яго слоў, да вынікоўага рашэння прыйшлі сумесна з ПРААН і Еўрапейскім саюзам, дакумент можа быць падпісаны ўжо 13 лістапада і ў такім выпадку закране 12 раёнаў краіны. Намеснік міністра назваў і сумы, прадугледжаныя праектам: па 500 тысяч еўра на рэгіён.

«У рамках гэтага дакумента, калі ён пройдзе ўсе працэдуры і запрацуе ў пачатку 2019 года, кожны з раёнаў зможа рэалізаваць шэраг ініцыятыў як па падтрымцы інфраструктуры, бізнесу, так і кластарных ініцыятыў, сацыяльнага прадпрымальніцтва», — растлумачыў Дзмітрый Матусевіч.

Форум пройдзе ў выставачным цэнтры «БелЭкспа». 13—14 лістапада адбудзецца выстаўка GEW EXPO — гэта першая пляцоўка для інавацыйных кампаній, якія гатовы прэзентаваць свае ідэі міжнароднай супольнасці і дзяржаве на самым высокім узроўні. Стэнды падзелены па секцыях: фінансавыя тэхналогіі, інвестыцыі, інавацыі, падтрымка бізнесу, адукацыя для бізнесу, тэхналогіі для бізнесу і тэхнічныя супольнасці.

Яшчэ адна пляцоўка — Міжнародны форум прадпрымальніцтва. Ён арганізаваны для прадстаўнікоў бізнес-супольнасці і стартап-экасістэмы. Мэта — абмеркаваць, як ствараць добры прадукт і развіваць бізнес. Перад гасцямі выступяць эксперты ў сваіх сферах, у тым ліку і замежныя.

Цікава, што Сусветны тыдзень прадпрымальніцтва разлічаны і на падлеткаў: так, 14 лістапада адбудзецца дзелавая канферэнцыя, на якой спікерамі выступяць юныя прадпрымальнікі. Яны прадставяць свае праекты і ідэі перад аўдыторыяй, для дзяцей уваход на мерапрыемства будзе бясплатны.

Не абышлося і без хакатона — гэта такі форум распрацоўшчыкаў, падчас якога спецыялісты з розных абласцей разам працуюць над рашэннем якой-небудзь праблемы. На Тыдні прадпрымальніцтва ён пачнецца 12 лістапада і будзе доўжыцца 48 гадзін. Тэхнічныя спецыялісты прымуць выклік ад міжнародных кампаній і створаць новае рашэнне пры ўдзеле экспертаў з Вялікабрытаніі. Дарэчы, сёлета задачы на форуме паставіць і знакамітая кампанія IKEA.

Тэматыка Тыдня ў многіх краінах розная, аднак ёсць тэма, якая аб'ядноўвае ўсіх, — гэта жаночае прадпрымальніцтва. У гэтым годзе ў Беларусі ў рамках нацыянальнага конкурсу «Прадпрымальнік года» Міністэрства эканомікі пагадзілася на тое, каб Міжнародная фінансавая карпарацыя ў Беларусі (адзін з партнёраў мерапрыемства. — **Аўт.**) выставіла дзве дадатковыя намінацыі: «Найлепшая жанчына-прадпрымальнік Беларусі» і «Найлепшы старт жаночага бізнесу».



Яшчэ адзін важны кірунак Тыдня, на які звярнулі ўвагу арганізатары, — інклюзіўнае прадпрымальніцтва. Саветнік па гандлёвых і эканамічных пытаннях Пасольства Вялікабрытаніі ў Беларусі Інэса Палтаран адзначыла, што вельмі важна падтрымліваць такія пачынанні, паколькі для інавацыйных ідэй бар'ераў не існуе.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Расія і Кітай падпішуць пагадненне аб разліках у нацвалютах замест долара



Расія і Кітай да канца бягучага года маюць намер падпісаць пагадненне аб разліках у нацыянальных валютах. Як паведаміў па выніках расійска-кітайскіх міжурадавых перамоў кіраўнік Знешэканамбанка Ігар Шувалаў, якога цытуе ТАСС, праект пагаднення прадстаўлены кіраўнікам урадаў дзвюх краін. Шувалаў заявіў, што ў Расіі і Кітая ўжо ёсць свой канал — аналаг сістэмы разлікаў SWIFT. «Трэба проста дамовіцца, як мы будзем узаемадзейнічаць, выкарыстоўваючы гэтыя каналы і іншыя формы, каб праводзіць разлікі. Мы разумеем, як гэтая схема павінна працаваць, яна павінна быць апісана ў пагадненні. У самыя кароткія тэрміны — было б выдатна, калі б мы змаглі падпісаць да канца года», — сказаў Шувалаў. Паводле яго слоў, кітайскі бок пры перамовах праявіў павышаную цікавасць да заключэння такога пагаднення, і кіраўнікам урадаў Расіі і Кітая ўжо прадстаўлены праект пагаднення аб узаемных разліках. «Яго абмяркоўвалі і міністры фінансаў, і намеснікі старшыні ўрада РФ, і намеснік прэм'ера дзяржсавета КНР», — паведаміў Ігар Шувалаў.

### У ЗША згарэў Рай



У Каліфорніі эвакуіраваны 50 тысяч чалавек з-за лясных пажараў, якія разгарэліся ў акрузе Б'ют, размешчанай у Цэнтральнай даліне штата на поўнач ад горада Сакрамэнта. Агонь ужо практычна цалкам знішчыў горад Парадайс (у перакладзе з англійскай — рай). Паведамляецца аб дзвюх тысячах будынкаў, знішчаных тут агнём. З горада, насельніцтва якога складае 27 тысяч чалавек, эвакуіраваны некалькі тысяч жыхароў. Дакладную колькасць пацярпелых і маштаб разбурэнняў пакуль немагчыма ацаніць, паколькі службовыя асобы не могуць прайсці ў небяспечную зону. На месцы працуюць каля 500 пажарных. «Увесь горад ахоплены агнём. Гэта выглядае жудасна», — цытуе члена гарадскога савета Скота Лотэра, якога эвакуіравалі з Парадайса разам з сям'ёй, выданне The Sacramento Bee. Больш за 32 тысячы жыхароў засталіся без электразабеспячэння. Губернатар штата Гэвін Ньюс абвясціў надзвычайнае становішча.

### У Грэцыі святароў пазбавяць статусу дзяржслужачых



У Грэцыі вырашылі перастаць плаціць дзяржаўную зарплату праваслаўным святарам. Адпаведная дамоўленасць, якая стала яшчэ адным крокам у бок раздзялення царквы і дзяржавы, была складзеная паміж прэм'ер-міністрам Алексісам Цыпрасам і прадстаяцелем Эладскай праваслаўнай царквы архіепіскапам Еранімам II. Святары і епіскапы больш не будуць лічыцца дзяржслужачымі. Мяркуецца, што гэтае рашэнне, якое закранае каля 10 тысяч святароў і работнікаў царквы, паспрыяе падзелу царквы з дзяржавай. Праваслаўная царква адыгрывае значную ролю ў грамадскім жыцці краіны. Праваслаўе лічыцца дзяржаўнай рэлігіяй у Грэцыі. Яго статус замацаваны ў канстытуцыі краіны, дзе яно пазначана як «пануючая рэлігія». Кіраўнікі дзяржавы і царквы паведамілі, што дзяржава будзе выдзяляць адпаведныя субсідыі. Гэтая сума складзе 200 млн еўра ў год, і яна будзе заставацца нязменнай незалежна ад таго, вырасце колькасць святароў або паменшыцца. У сваю чаргу царква паабяцала не чыніць перашкод у выпадку, калі вага рэлігіі ў грамадстве будзе змяншацца, і адмовіцца ад патрабаванняў на нерухомую маёмасць пасля таго, як яна перайшла ва ўласнасць дзяржавы.

## Блізкая ўлада

### Адміністрацыя выслухае

**Кіраўніцтва і службовыя асобы Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі працаваюць ажыццяўляць выязныя прыёмы грамадзян і юрыдычных асоб у рэгіёнах.**

**13 лістапада** ў Петрыкаўскім райвыканкаме прыём праводзіць памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — **інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ШУЛЕЙКА.**

**14 лістапада** ў Лагойскім райвыканкаме грамадзян выслухае **начальнік галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення Андрэй МАЦЕЛЬСКІ.**

У той жа дзень у адміністрацыі Заводскага раёна г. Мінска можна трапіць на прыём да намесніка начальніка галоўнага эканамічнага ўпраўлення — **начальніка ўпраўлення развіцця вытворчага патэнцыялу Мікалая РАГОЖНІКА.**

**15 лістапада** ў Шаркаўшчынскім райвыканкаме правядзе прыём памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — **інспектар па Віцебскай вобласці Віталь ВОЎК.**

У той жа дзень правядзе прыём у Пінскім райвыканкаме першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб — **начальнік упраўлення пісьмовых і электронных зваротаў Крысціна ПОБАЛЬ** (11.30 — 14.30).

**16 лістапада** ў Шчучынскім райвыканкаме можна трапіць на прыём да **Юрыя КРЫВАШЭЕВА, начальніка галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі.**

**Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў і адміністрацыі раёнаў Мінска. Усе мерапрыемствы адбудуцца з 10.00 да 13.00.**

## Падаткі

### Каля 170 тысяч беларусаў маюць дзве і больш кватэры

#### Колькасць уладальнікаў дадатковага жылля павялічваецца штогод амаль на 10 %

**Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення падаткаабкладання даходаў і маёмасці фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй Кавалеўскі. Ён нагадаў, што да 15 лістапада неабходна аплаціць зямельны падатак, падатак на нерухомасць і арэндную плату за зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці. Ад падатку на нерухомасць вызваляюцца ўладальнікі адной кватэры. Тым, у каго іх дзве і больш, трэба гэты падатак плаціць. А такіх у нас крыху больш за 169 тысяч чалавек.**

Паводле інфармацыі падатковага ведамства, плацельшчыкамі зямельнага падатку і падатку на нерухомасць у нашай краіне з'яўляюцца каля 2,8 мільёна фізічных асоб. Але з улікам разнастайных ільгот іх фактычна аплачваюць 1,5 мільёна грамадзян. Сёлета насельніцтву было прад'яўлена да выплаты 75,3 мільёна рублёў маёмасных падаткаў, з іх 42,4 мільёна рублёў — падатак на нерухомасць, 20,7 мільёна рублёў — зямельны падатак, а 12,2 мільёны рублёў — арэндная плата за зямлю.

Прадстаўнікі падатковай інспекцыі адзначылі, што за нявыплату згаданых падаткаў заканадаўствам прадугледжана накладанне пені і адміністрацыйнага штрафу, мінімум якога раўняецца палавіне базавай велічыні.

Андрэй Кавалеўскі паведаміў, што кожны год у нашай краіне **падатковыя органы аналізуюць даходы і расходы 20—25 тысяч чалавек,** якія здзейсніці буйныя пакупкі. **Прыкладна пяці тысячам з іх прыходзіцца даплачваць падаткі па стаўцы 16 % гадавых.**

Як вядома, цяпер карэктуецца новы Падатковы кодэкс, які, згодна з планамі, запрацуе ў нашай краіне з 1 студзеня наступнага года. Адказваючы на пытанні журналістаў, Андрэй Кавалеўскі ўдакладніў, што кардынальных змяненняў у аплаце зямельнага падатку і падатку на нерухомасць у 2019 годзе не будзе. Плануецца захаваць той жа парадак аплаты і тэрміны. Прапануецца таксама захаваць даволі вялікі аб'ём ільгот па аплаце гэтых падаткаў. «Яны даюцца асобным найбольш уразлівым катэгорыям насельніцтва — пенсіянерам, інвалідам, непрацаздольным асобам, шматдзетным сем'ям. **Пакуль не плануецца ўводзіць і падаткаабкладанне кожнай кватэры — гэта значыць палёгку пры наяўнасці ва ўласнасці адной кватэры мяркуецца захаваць»,** — растлумачыў Андрэй Кавалеўскі.

Новы Падатковы кодэкс падрыхтаваны з улікам таго, што яго дзеянне будзе распаўсюджвацца на наступныя тры гады — 2019, 2020 і 2021-ы. За гэты час дзяржаўныя органы павінны адпрацаваць усе нюансы, якія ўзнікнуць у названы перыяд, у тым ліку магчымыя пытанні змены ўзносаў у фонд сацыяльнай абароны насельніцтва і іншыя прапановы. За тры гады павінны быць выпрацаваны адзіныя рашэнні па гэтых пытаннях, каб да 2022 года падрыхтаваць новую заканадаўчую базу, калі гэта будзе неабходна.

Андрэй Кавалеўскі падкрэсліў: «Падатковы кодэкс павінен дзейнічаць тры гады без змен, і гэта будзе вельмі зручна для падаткаплацельшчыкаў — арганізацый і грамадзян».

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ГОРКАЯ ПАМЯЦЬ ЗЯМЛІ

У нядзелю ўвесь свет адзначыць юбілейную дату — 100-годдзе з дня заканчэння Першай сусветнай вайны. Святочныя мерапрыемствы з удзелам лідараў дзяржаў адбудуцца ў Францыі, дзе і было падпісана пагадненне, якое паклала канец адной з самых жахлівых войнаў чалавецтва.

Пройдуць дні памяці і ў Беларусі. Учора дэлегацыі і паслы замежных краін усклалі кветкі да мемарыяльнага комплексу, усталяванага ў гонар загінулых у Першай сусветнай вайне на Брацкіх ваенных могілках. Нашчадкі тых, хто некалі ваяваў па розныя бакі, сустрэліся, каб хвілінай маўчання ўшанаваць памяць тых, хто паў ахвярай палітычных канфліктаў пачатку ХХ стагоддзя. Ад беларускага боку на мерапрыемстве прысутнічаў намеснік міністра замежных спраў Алег Краўчанка.





Прадаўжэннем мерапрыемстваў, прысвечаных юбілейнай даце, стане багаслужэнне ў храме-помніку ў гонар Усіх Святых, якое адбудзецца 11 лістапада.

**Андрэй САЗОНАЎ. Фота аўтара.**

Актуальна

# Абаронім нашых дзяцей

**Штогод у краіне выяўляюцца і прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці некалькі дзясяткаў распаўсюджвальнікаў дзіцячай парнаграфіі ў інтэрнэце. Усяго з 2009 года зафіксавана 434 злачынствы, звязаныя з абаротам дзіцячай парнаграфіі. За 9 месяцаў бягучага года выяўлена 54 такія злачынствы. Пачынаючы з 2005 года ўстаноўлена 149 непаўналетніх дзяцей, з іх — 79 малалетнія, якія былі выкарыстаныя ў порназдымках і матэрыялы з якімі распаўсюджваліся ў інтэрнэце. Праблема дзіцячай прастытуцыі таксама існуе. З 2005 года ў аказанне інтымных паслуг было ўцягнута 300 дзяцей.**

Як паведаміў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі Дзмітрый ЦАЮН,** Міністэрства ўнутраных спраў у поўнай меры ўсведамляе маштабы пагрозы і імкнецца адэкватна рэагаваць на звязаныя з ёй выклікі.

З 2007 года ў нашай краіне пачалі выяўляцца выпадкі вырабу парнаграфічнай прадукцыі ў падпольнай студыі з прыцягненнем дзяцей і распаўсюджваннем падобных здымак у інтэрнэце на розных спецыялізаваных платных сайтах. Дзякуючы своечасова прынятым мерам у Беларусі была спынена дзейнасць некалькіх злачынных груп, якія займаліся вырабам і распаўсюджваннем дзіцячай парнаграфіі ў сецїве. З улікам нарастання пагроз, звязаных з гэтай з'явай, па ініцыятыве МУС са снежня 2008 года дзейнічае новая норма Крымінальнага кодэкса, якая прадугледжвае адказнасць за такога роду злачынства. За выраб і распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару з выявай непаўналетніх прадугледжваецца пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да 13 гадоў.

У беларускім заканадаўстве паняцце дзіцячай парнаграфіі адпавядае ўсім міжнародным стандартам.

Падраздзяленні па барацьбе з падобнымі правапарушэннямі актыўна ўкараняюць у сваю дзейнасць праграмнае забеспячэнне CPS, распрацаванае і прызначанае для збору і аналізу адкрытай інфармацыі з файлаабменных сетак з мэтай выяўлення асоб, якія распаўсюджваюць альбо калекцыяніруюць дзіцячую парнаграфію. На сённяшні дзень дадзеным праграмным прадуктам карыстаюцца 77 краін свету. Па хадайніцтве нашай краіны распрацоўшчыкі CPS пераклалі сваю праграму на беларускую мову, што істотна павышае эфектыўнасць яе выкарыстання.

Гаворачы аб іншых формах дзіцячай эксплуатацыі, трэба адзначыць, што, згодна з нацыянальным і міжнародным заканадаўствам, любыя дзеянні, якія накіраваны на выкарыстанне дзіцяці, нават не звязаныя з якім-небудзь уздзеяннем на яго — мае месца ўяўная добраахвотнасць, — лічацца гандлем людзьмі. У гэтай сувязі МУС прапануе разглядаць гандаль дзецьмі як самастойны від злачынства, які ахоплівае ўсе формы дзіцячай эксплуатацыі незалежна ад сродкаў уздзеяння.

— У цэлым сітуацыя не з'яўляецца крытычнай для нашай краіны і не выходзіць з-пад кантролю, — падкрэсліў Дзмітрый Цаюн. — Аднак ёсць дакладнае разуменне, што ў частцы заканадаўства трэба ўдасканальваць тыя нормы, якія існуюць, з ужываннем актуальных формаў і метадаў барацьбы супраць такіх негатыўных з'яў, як распаўсюджванне дзіцячай парнаграфіі і прастытуцыі ў інтэрнэце.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# Асцярожна: туман!



Фота БелТА.

**У апошнія дні моцны туман пануе практычна на ўсёй тэрыторыі Мінскай, а таксама Гомельскай і Гродзенскай абласцей, бачнасць на асобных участках аўтамабільных дарог складае 100—200 метраў. Нездавальняючыя ўмовы надвор'я захаваюцца і ў бліжэйшыя дні, а сёння, 10 лістапада, з-за туману ў краіне аб'яўлены аранжавы ўзровень небяспекі.**

УДАІ УУС Мінскага аблвыканкама рэкамендуе аўтамабілістам у такіх умовах абавязкова рухацца з уключаным блізкім святлом фар. Ехаць варта з асаблівай асцярожнасцю, не перавышаць хуткасць, не парушаць правілы абгону, а пры бачнасці 100 і менш метраў і зусім пазбягаць абгонаў, захоўваць дыстанцыю, нават лепш павялічыць яе, і пастаянна кантраляваць сітуацыю на дарозе. Не лішнім будзе пазбягаць рэзкіх манеўраў і тармажэнняў, а таксама павысіць пільнасць пры праездзе пешаходных пераходаў як у гарадах, так і на трасах. У выпадку вымушанага прыпынку неабходна паркаваць аўто як мага далей ад праезнай часткі, у абавязковым парадку ўключаць аварыйную сігналізацыю, а пры выхадзе з машыны кіроўцам неабходна надзяваць святлоадбівальныя камізэлькі.

Пешаходам ДАІ нагадвае, што іх бяспека цалкам залежыць ад іх самых і настойліва рэкамендуе праяўляць асаблівую ўвагу пры пераходах любой праезнай часткі, а ў цёмны час сутак абавязкова абазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі. Таксама пешаходы павінны памятаць, што на слізкай дарозе тармазны і прыпынachны шляхі любой машыны павялічваюцца ў разы.

**Ул. інф.**

# Трэнерскі штаб «зуброў» пакідае клуб



**Пра гэта паведамілі ў прэсслужбе хакейнага «Дынама-Мінск». Галоўны трэнер Гордзі Дуаер звольнены, з трэнерамі Сяргеем Стасем і Канстанцінам Кальцовым, а таксама настаўнікам па варатарах Андрэем Кудзіным, трэнерам па фізпадрыхтоўцы Генадзем Лянго і трэнерам-селекцыянерам Юрыем Кузьмянковым кантракты скасаваны па пагадненні бакоў.**

*«Камандзе патрэбны радыкальныя перамены, таму, сумесна з трэнерамі абмеркаваўшы становішча спраў, мы прыйшлі да аднадушнай высновы, што спыненне супрацоўніцтва з цяперашнім трэнерскім штабам павінна надаць станоўчы імпульс нашай камандзе»,* — каментуе навіну **генеральны дырэктар ХК «Дынама-Мінск» Дзмітрый БАСКАЎ.** Ён адзначыў, што гульцам неабходна кардынальнае паляпшэнне практычна ўсіх кампанентаў гульні. У такія моманты рэзкія рашэнні апраўданыя, толькі так магчыма нешта змяніць. Хутка будзе абвешчана пра тое, хто заменіць Гордзі Дуаера і яго асістэнтаў. Новы трэнерскі штаб прыступіць да работы ў найбліжэйшы час, каб падрыхтаваць каманду да матча супраць «Трактара», які адбудзецца ўжо заўтра. Мяркуецца, што яго ўзначаліць цяперашні трэнер зборнай Беларусі Андрэй Сідарэнка.

Нагадаем, Дуаер прыняў каманду летам мінулага года. На цяперашні момант «Дынама-Мінск» займае апошняе месца ў Заходняй канферэнцыі, ад зоны плэй-оф нашу каманду аддзяляе сем ачкоў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Я зноў выбіраю «Звязду»

# ...Бо сяброў сапраўды не мяняюць

Пасля заканчэння факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта я пяць гадоў працаваў у Стаўбцоўскай раённай газеце «Прамень» і вось ужо трыццаць — ва Уздзенскай «Чырвонай зорцы». За гэты час даводзілася мець справы (супрацоўнічаць альбо друкавацца) з абласным і пераважнай большасцю рэспубліканскіх выданняў, не адно з іх выпісваць на больш ці менш тэрмін, пастаянна купляць у кіёсках Белсаюздруку. Такім чынам, у кожнай газеты выяўляліся як свае плюсы, так і мінусы. А вось надзейным, правераным сябрам усе 35 гадоў была і застаецца «Звязда».

Цікавасць да яе пачалася з таго, што, атрымаўшы свежы нумар, пачынаў шукаць там прозвішчы знаёмых па вучобе журналістаў Алены Ціхановіч і Валянціна Жданко, потым — іншых маладых ці не вельмі, але дасведчаных, адказных за справу прафесіяналаў... У тыя не такія ўжо і даўнія 90-я мінулага стагоддзя «Звязда», як ніякая іншая газета, была смелай, уважлівай да праблем чалавека, адказнай за кожнае слова.

Апроч таго, вялікім дасягненнем звяздоўцаў была і застаецца іх прыхільнасць да роднага слова. Па сутнасці, гэта выданне — ці не адзіны суразмоўнік, які гаварыў, гаворыць і, спадзяюся, будзе гаварыць з чытачом па-беларуску. Прыклад «Звязды» дапамагаў і мне на сваім узроўні на працягу дзесяцігоддзяў адстойваць такую ж пазіцыю: у раённай газеце Уздзеншчыны (радзімы многіх класікаў беларускай літаратуры, вядомых дзеячаў культуры і мастацтва) на рускай мове друкуюцца толькі вершы, праграма тэлебачання ды асобныя рэкламныя матэрыялы. Такой жа пазіцыі прытрымліваліся і калегі са Стоўбцаў, Валожына, некаторых іншых раёнаў Міншчыны.

...Друкаваліся на старонках «Звязды» і мае допісы — краязнаўчыя артыкулы, літаратурныя спробы, праўдзівыя гісторыі ў рубрыцы «Алё, народ на провадзе!», вершаваныя радкі на конкурс «Хто каго?».

Зрэшты, не буду пералічваць рубрыкі ды прозвішчы аўтараў, якія найбольш падабаюцца. Густ у кожнага свой. А вось што несумненна, дык гэта высокі ўзровень «Звязды», газеты, у «асобе» якой, відаць, кожны знойдзе калі не вернага сябра, то шчырага суразмоўніка.

**Віктар Сабалеўскі,**

г. Узда.

Спадчына ў законе

# Мова наша

## Ці важна, як гавораць на богаслужэнні?

**Днямі адбылося пасяджэнне Кансультатыўнага міжканфесійнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. На ім прысутнічалі як службовыя асобы, так і святары самых розных канфесій — у тым ліку праваслаўных, католікаў, іўдзеяў, лютэран, хрысціян веры евангельскай і іншых. На пасяджэнні абмяркоўвалі самыя вострыя пытанні, датычныя жыцця канфесій, напрыклад моўныя і палітычныя аспекты.**

— Каталіцкая царква скончыла вялікую працу па перакладзе Бібліі на беларускую мову, — адзначыў **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід ГУЛЯКА.** — Аднак у мяне ўзнікае пытанне, даволі нечаканае: для чаго гэта было зроблена?.. Тлумачу сваю думку. У Гродзенскай вобласці працуе 23 ксяндзы з Польшчы, і ніводзін з іх не выкарыстоўвае ні беларускую, ні рускую мовы!.. У нас даволі лаяльнае заканадаўства ў гэтым плане. Але нядаўна я сустракаўся са сваімі калегамі з Літвы. Калі размова зайшла пра тое, на якой мове ў іх праводзяць богаслужэнні запрошаныя святары, яны адказалі, што такое там увогуле не абмяркоўваецца — не выкарыстоўваецца ніякая іншая мова апроч літоўскай. Біблію пераклалі, паэтому пра гэта распавялі — гэта ўсё надзвычай добра. І я стаўлюся з вялікай павагай да перакладу Біблії на беларускую мову. Аднак трэба, каб тое, што зроблена, стыкавалася з мовай, якая на практыцы выкарыстоўваецца ў служэнні.

У сваю чаргу вікарны **епіскап Мінска-Магілёўскай архіепархіі Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі Юрый КАСАБУЦКІ** адказаў: «Не ўсё адразу. Мы і так маем даволі вялікі прагрэс ва ўвядзенні беларускай мовы ў богаслужбовую практыку. Такога прагрэсу, як у нас, няма нідзе ў свеце».

«Такога прагрэсу, як у Беларусі, нідзе ў свеце не шукаюць, — адказаў Леанід Гуляка. — Таму што службы вядуцца на мовах тых краін, дзе яны ладзяцца».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению РДУП по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гомельоблнефтепродукт» (продавец) извещает о проведении **20 ноября 2018 года** открытого аукциона по продаже имущества – лот № 13: Стенд для проверки электрооборудования Э-250-02 (инв. № 5956г). **Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), 24,50 бел. руб. Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), 2,45 бел. руб.** Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». **Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 18.10.2018 г.** УНП

# ГРОШЫ З ПУСТЫХ БУТЭЛЕК



Рассартаваная па колеры тара каштуе на капейку даражэй.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Унутры прыёмнага пункта трывалы пах віна-гарэлачнага і кантынгент збольшасці — адпаведны. Некаторыя на месцы сартуюць бутэлькі па колеры — у такім выглядзе кілаграм шклабою каштуе на капейку даражэй.

— Ды нармальныя цэны. Яшчэ нядаўна за кілаграм шклабою сем капеек давалі, а цяпер — 15, — дзеліцца адзін з мужчын. — Я дзве сумачкі прынёс, яшчэ не здаў: чарга, бачыце? Усё з дому — па вуліцы не збіраю.

Каля акенца тару выгружае невысокая бабуля — дзве бутэлькі з-пад мінералкі і два трохлітровыя слоікі. «З-пад агуркоў і памідораў, — кажа. — Мы нарыхтоўкі ў краме купляем, а слоікі здаём».

Пажылая жанчына тлумачыць: прыносіць шклатару не дзеля прыбаўкі да пенсіі.

— У мяне ёсць сын, дачка, муж. Мы нядрэнна жывём. Я люблю, каб было чыста і акуратна, таму бутэлькі і здаю. Заадно і шпацыр раблю — я жыву за чатыры прыпынкі адсюль.

**Прыёмшчык Анатоль РАВІНЧЫК**, які працуе ў гэтым нарыхтоўчым пункце вось ужо 20 гадоў, зазначае, што сюды заходзяць не толькі аматары выпіць.

— Ад школьніка да інтэлігента, — характарызуе здатчыкаў. — Прыходзяць нармальныя, акуратныя людзі. Некаторыя кажуць: «Нашто я буду засмечваць навакольнае асяроддзе? Лепш прынясу шкло сюды». Хтосьці проста побач жыве і па дарозе ў краму здае пустыя бутэлькі.

Па словах мужчыны, некаторыя гараджане прывозяць і па 20—30 кілаграмаў — нават пажылыя. «Адна жанчына дзялілася: «Мне 83 гады. Калі б я сядзела ў кватэры, ужо б памерла. А так рухаюся, на свежым паветры бываю», — успамінае Анатоль.

## Шклянкі і фужэры не прымаюцца

Наплыў здатчыкаў заўсёды назіраецца пасля выхадных. За дзень можа прыйсці сто чалавек і больш. Самая хадавая бутэлька тут — гарэлачная ці вінная. Яна, дарэчы, і самая дарагая — 12 капеек за штуку. Астатнія каштуюць ад 7 да 10 капеек. Пакідаюць таксама слоікі з-пад засолак (за трохлітровы даюць 30 капеек, а за паўлітровы — пяць), сокаў, дзіцячага харчавання. Адзін са здатчыкаў, напрыклад, які мае пяцёра малых, мяхамі прывозіць слоікі ад пюрэ.



Сярод здатчыкаў шмат пенсіянераў.

— Забракаванай тары цяпер няма — усё ідзе на бой. Мы прымаем толькі харчовае шкло. Шклянкі, фужэры, шыбы — гэта тэхнічнае шкло, там ёсць дабаўленне свінцу. Слоікі з-пад лекаў таксама не бяром, бо гэта медыцынскае шкло, яно ўтылізуецца адмысловым спосабам, — тлумачыць прыёмшчык.

Колькі за дзень гараджане не прыносяць сыравіны ў пункт? Глядзім ведамасць за аўторак: шкла паступіла амаль на 405 рублёў. Калі па асобных пазіцыях, то жыхары навакольных дамоў здалі 792 вінныя, гарэлачныя і піўныя бутэлькі, 156 трохлітровых і 74 паўлітровыя слоікі, а таксама 1865 кілаграмаў шклабою.

Раней, кажа Анатоль, асартымент тары, якая прымалася, быў іншы, бо многія заводы выкарыстоўвалі бутэлькі паўторна. Сёння з тых жа піўных кампаній толькі «Аліварыя» бярэ зваротную тару.

## Сыравіна для фарбы і керамічнай пліткі

Летась у Беларусі было сабрана 181,3 тысячы тон адходаў шкла. Для параўнання: у 2012 годзе гэта было 59,1 тысячы тон.

Перапрацоўкай такіх адходаў займаецца завод «Белрэсурсы» ў Мінскім раёне. У выніку атрымліваюць другасную сыравіну — рассартаваны па колеры, ачышчаны ад прымесяў, здробнены шклабой: паўбелы, зялёны, карычневы. Яго выкарыстоўваюць на шклатарных заводах Гродна, Гомеля, Ялізава (Асіповіцкі раён) у якасці дабаўкі ў шыхту (сумесь матэрыялаў для плаўкі) пры вытворчасці бутэлек і слоікаў. Сыравіна ідзе таксама ў фарбу для дарожнай разметкі, ізаляцыйныя матэрыялы (шклавату), керамічную плітку. Усяго ў краіне восем заводаў, якія паўторна выкарыстоўваюць адходы шкла.

Але чаму нямногія вытворцы напояў прымаюць свае бутэлькі, каб зноў паставіць іх на канвеер? Атрымліваецца, выпусціць новыя больш танна, чым апрацаваць старыя?

— Гэта так, — адказвае **намеснік начальніка ўпраўлення па каардынацыі дзейнасці ў сферы абыходжання з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі Апаратара другасных матэрыяльных рэсурсаў Аляксей ПІСКУН.** — У часы Савецкага Саюза і ў 90-я гады выкарыстоўвалася абмежаваная колькасць разнавіднасцяў бутэлек для разліву напояў. Сабраць выкарыстаныя і вярнуць іх на заводы было проста. Сёння гэта складана зрабіць: у нас сотні бутэлек па тыпе і памеры.

Вядома, паўторнае выкарыстанне ўпакоўкі значна больш экалагічнае за перапрацоўку, якая патрабуе затрат энергетычных рэсурсаў, адзначае Аляксей Піскун. Па Указе Прэзідэнта № 313 створаны эканамічны стымул не браць новае шкло — гэта механізм пашыранай адказнасці вытворцаў і імпарцёраў тары за адходы. Калі прадпрыемства выпускае ці ўвозіць у краіну бутэлькі і слоікі, яно плаціць пэўны збор.

## Аўтаматы за 100 мільёнаў еўра

У Еўропе ў крамах часта можна ўбачыць тараматы — аўтаматы для прыёму выкарыстаных бутэлек (не толькі шкляных, але і пластыкавых, алюмініевых). Набываючы напой, ты плаціш заклад за ўпакоўку, а калі здаеш яе — заклад вяртаюць. Такі эканамічны стымул не выкідаць другасную сыравіну ў смецце. Укараненне падобнай дэпазітнай закладной сістэмы ў Беларусі запланавана ў 2020 годзе ў рамках дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе».




За дзень у пункт прыёму прыходзіць каля ста чалавек.



Цана на бутэльці — ад 7 да 12 капеек за штуку.

Аляксей Піскун тлумачыць прынцып дзеяння тараматаў:

— Абсталяванне пры прыёме бутэлек счытвае іх параметры, спецыяльную маркіроўку, каб ідэнтыфікаваць, ці ўдзельнічаюць яны ў дэпазітнай сістэме. Гэта значыць, ці ўключыў вытворца або імпарцёр напою сваю тару ў пералік. Аўтамат прыме і айчынную, і імпартную бутэльку, якая прададзена ў нас, калі яна ёсць у дэпазітнай сістэме. За ўпакоўку абсталяванне выдасць чэк, які можна будзе залічыць, прыкупляючы штосьці ў краме.

Сума закладу пакуль абмяркоўваецца. Але, акцэнтуе ўвагу эксперт, гэта не кошт пустой тары. Гэта стымулюючая сума — такая, якая будзе мець значнасць для большасці жыхароў краіны, каб вярнуць пустую ўпакоўку. На сёння аптымальным лічаць плаціць за здадзеную бутэльку 20 капеек.

Тараматы ўсталююць па ўсёй краіне ў гандлёвых аб'ектах, дзе найбольшая праходнасць пакупнікоў. Мяркуецца, што гэта будзе некалькі тысяч штук. У сельскай мясцовасці зварот бутэлек будзе весціся ўручную.

— Увесь праект стварэння дэпазітнай сістэмы збору тары ў Беларусі патрабуе 100 мільёнаў еўра, — дзеліцца намеснік начальніка ўпраўлення. — Для рэалізацыі прапануецца прыцягнуць замежнага інвестара. Важна адзначыць, што гэта сістэма не будзе камерцыйным праектам. Зарабляць на ёй ніхто не будзе. Задача выключна экалагічная і сацыяльная — за кароткі перыяд часу зрабіць так, каб больш за 80 працэнтаў усёй упакоўкі (і пластыкавай, і алюмініевай) вярталася на перапрацоўку ці паўторнае выкарыстанне. Вопыт краін Еўропы, якія ўкаранілі такую сістэму, паказаў, што гэтага можна дасягнуць за год-два.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**


## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (микрорайон «Южный-4») 11 декабря 2018 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-6* | ул. Одельская, между участком домовладения № 73 и ул. Ланского | 0,0834 | 440100000001010493 | 3 286,55 | 12 527,89 | 2 400 |
| 2 | Земельный участок* | ул. Ланского, на земельном участке, примыкающем к участку домовладения № 9 | 0,1241 | 440100000001010488 | 3 046,34 | 18 403,70 | 3 600 |

*Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельный участок имеет ограничения

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 11 декабря 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования.

Дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 с 12 ноября по 5 декабря 2018 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 74 20 95, 72 05 46, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**

# ПРАЦАВАЦЬ У ГАРМОНІІ З РЫНКАМ


Намеснік дырэктара цэнтра Алег БАРОВІЧ — за дакладнасць вымярэнняў.

**Зусім нядаўна наша газета шырока расказвала аб рабоце першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны. У рамках форуму прайшла і тэматычная канферэнцыя «Ліквідаванне тэхнічных бар'ераў ва ўзаемным гандлі метадамі тэхнічнага рэгулявання». А на пляцоўцы аднаго з яе арганізатараў — Гомельскага цэнтра стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі — адбылося 3-е пасяджэнне беларуска-ўкраінскай рабочай групы па тэхнічным рэгуляванні, стандартызацыі і метралогіі. Напярэдадні Сусветнага дня якасці мы пабывалі ў цэнтры і папрасілі яго работнікаў расказаць аб штодзённых клопатах свайго калектыву.**

**Расказвае дырэктар Аляксандр КАЗАЧОК:**

— Супрацоўніцтва з суседзямі было і раней. Невыпадкова знешнеэканамічны абарот між Беларуссю і Украінай складае 5 мільярдаў 200 тысяч долараў ЗША. Іншая рэч, што яго трэба нарошчваць. Аб гэтым гаварылі і прэзідэнты на сваёй нядаўняй сустрэчы. А члены беларуска-ўкраінскай рабочай групы па тэхнічнаму рэгуляванню, стандартызацыі і метралогіі абмеркавалі актуальныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва. Безумоўна, за гады пасля распаду вялікай краіны нашы дзяржавы адышлі адна ад адной па розных кірунках дзейнасці, у тым


3-е пасяджэнне беларуска-ўкраінскай рабочай групы па тэхнічным рэгуляванні, стандартызацыі і метралогіі.

ліку і ў тэхнічным рэгуляванні, акрэдытацыі, адзнацы адпаведнасці і метралогіі. Але гэта не азначае, што мы не павінны гандляваць паміж сабой, супрацоўнічаць і дапамагаць адно аднаму. На ўзроўні Дзяржстандартаў гэта не першая сустрэча.

Калі ўлічыць, што аб'ёмы эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін будуць нарастаць, то перспектывы нашых стасункаў з украінскімі калегамі даволі шырокія. Ва Украіне ёсць метал, вугаль, шмат зерневых культур, а ў нас развітыя машынабудаванне, у тым ліку і ў галіне сельскай гаспадаркі, жывёлагадоўля, так што сфера ўзаемных інтарэсаў аб'ёмная.

Таму заключаныя раней і зараз дамоўленасці паміж беларускімі і ўкраінскімі нацыянальнымі сістэмамі па акрэдытацыі і адзнацы адпаведнасці маюць проста велізарнае значэнне. Апошні прыклад — падпісанае на канферэнцыі пагадненне паміж БелДІМам і адпаведным цэнтрам з Івана-Франкоўска аб узаемным прызнанні вынікаў выпрабаванняў сродкаў вымярэння. Вытворцам не трэба будзе вазіць праз мяжу вырабы на выпрабаванні, яны пройдуць іх дома.

А тэхнічнае рэгуляванне дае магчымасць як замацавання айчынных тавараў на рынках іншых краін, так і абароны ўласнага рынку ад кантрафактнай прадукцыі.

**Намеснік дырэктара Галіна КАЦУБА** звяртае нашу ўвагу на «падвойнае» свята ўсіх тых, хто стаіць на варце якасці выпускаемай прадукцыі.

— З 5 па 11 лістапада праводзіцца Еўрапейскі тыдзень якасці, традыцыйна ён уключае ў сябе і Сусветны дзень якасці — сёлета гэта 8 лістапада. У рамках Еўрапейскага тыдня якасці мы праводзім дні адкрытых дзвярэй — для папулярызацыі як стандартызацыі, метралогіі, метадаў выпрабаванняў, так і дзейнасці нашай арганізацыі. У прыватнасці, для студэнтаў гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта, універсітэта імя Францыска Скарыны. Да слова сказаць, у цэнтры створаны і дзейнічае філіял яго кафедры оптыкі. Для студэнтаў політэхнічнага ўніверсітэта імя Сухога. Прыходзілі і старшакласнікі гарадскіх школ, прыглядаліся да будучай прафесіі. У лік мерапрыемстваў увакодзіць і правядзенне круглых сталоў па сістэмах менеджменту, укараненні новай версіі — падтрыманні і развіцці яе, па правядзенні ўнутраных аўдытаў.

Дзейсным сродкам барацьбы за якасць прадукцыі і паслуг з'яўляюцца сістэмы менеджменту якасці (СМЯ) — гэта жывы арганізм, які пастаянна развіваецца, — падкрэсліла Галіна Хамітаўна. — Яшчэ і таму, што ўдасканальваюцца самі міжнародныя стандарты, на якіх грунтуюцца сістэмы. Свежы прыклад — замена стандарту 9001 — 2009 больш дасканалым стандартам 9001 версіі 2015 года. Новая версія стандарту патрабуе ад вытворцаў прымянення рызыкаарыентаванага мыслення.


Пасяджэнне круглага стала, прысвечанага Дню стандартызацыі, вядзе дырэктар цэнтра Аляксандр КАЗАЧОК.

Па ўкараненні сістэм менеджменту якасці працуем не толькі з прадпрыемствамі сваёй вобласці. Скажам, з ААТ «Белсолад» з Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Супрацоўнічаем ужо даўно па ўкараненні сістэм НАССР. Зараз яны падалі нам заяўку па ўкараненні сістэм менеджменту бяспекі харчовай прадукцыі па СТБ ІСО 22000.

Таксама праводзім семінары з прадстаўнікамі малога і сярэдняга бізнесу па пытаннях сертыфікацыі прадукцыі і паслуг. Прыходзяць да нас наведвальнікі ў выпрабавальны цэнтр, у нашы лабараторыі, знаёмім іх з новым абсталяваннем і прагрэсіўнымі метадамі выпрабаванняў.


Дзень адкрытых дзвярэй для студэнтаў гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта.

**Інжынер па стандартызацыі Надзея УЛЬЯНКІНА** засяродзіла свой расказ на ўдзеле Гомельскага ЦСМС у рабоце над праектамі міждзяржаўных стандартаў.

— Міждзяржаўнай стандартызацыі ўдзяляецца шмат увагі яшчэ і таму, што ідзе глабалізацыя рынкаў. Каб наш вытворца быў падрыхтаваны да патрабаванняў, якія вылучаюць знешнія рынкі, дыктуе сённяшні дзень, і мог эфектыўна працаваць на экспарт, яму трэба ведаць гэтыя патрабаванні. Не выключана, што спатрэбіцца і пераарыентаваць сваю вытворчасць.

Прыкладна адзін раз на тыдзень мы атрымліваем пакет новых міждзяржаўных стандартаў. Робім рассылку прадпрыемствам, шукаем зацікаўленых. І працуем з імі. Вырашаем разам, якім чынам варта ўдасканальваць вытворчасць, магчыма, набыць новыя аўтаматычныя лініі для выпуску больш высокатэхналагічнага прадукту, паклапаціцца пра новую ўпакоўку ці наогул абнавіць наменклатуру вырабаў. З іх канкрэтнымі прапановамі мы працуем і рыхтуем кансалідаваны адказ ад гомельскага рэгіёна па праектах міждзяржаўных стандартаў ва ўпраўленне тэхнічнага рэгулявання Дзяржстандарту РБ і далей у Міждзяржаўны Савет па стандартызацыі.

А калі распрацоўваем дзяржаўныя стандарты, то імкнёмся да гарманізацыі з патрабаваннямі адпаведных міжнародных дакументаў. Мы не павінны вынаходзіць веласіпед. Калі стандарт ужо існуе, то варта разгледзець яго і магчымасць прымянення на нашай тэрыторыі, а не ствараць цалкам новы. Вядома, існуе шмат нацыянальных нюансаў, узяць хоць бы кліматычныя асаблівасці. Ці ўмовы вытворчасці, якія таксама могуць быць розныя.

Зараз распрацоўваецца дакумент па стратэгіі стандартызацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 года, мы далі свае прапановы.

**Начальнік аддзела сістэм менеджменту Таццяна КАНАПЛЁВА** падкрэсліла:

— Мы не адзіны орган па сертыфікацыі сістэм менеджменту на Гомельшчыне, прадпрыемствы могуць працаваць у гэтым кірунку і з іншымі цэнтрамі. Статыстыка тут такая: па стане на пачатак лістапада гэтага года па Гомельскай вобласці сертыфікавана па сістэме менеджменту якасці ў адпаведнасці з СТБ ISO 9001 усяго 424 прадпрыемствы, з іх 141 прадпрыемства — органам па сертыфікацыі сістэм менеджменту дзяржаўнага прадпрыемства «Гомельскі ЦСМС».

Укараненне сістэм менеджменту якасці з'яўляецца важным накірункам для краіны, для павышэння канкурэнтаздольнасці эканомікі і саміх арганізацый.

— З гэтай мэтай аддзел шмат працуе з прадпрыемствамі вобласці?

— Лепш за ўсё зноў жа сказаць мовай статыстыкі. Летась супрацоўнікі аддзела аказалі аналітычную і растлумачальную дапамогу па ўкараненні СМЯ ў адпаведнасці з СТБ ISO 9001-2015 у 43 арганізацыях, а за 10 месяцаў гэтага года — у 45 арганізацыях. Укараненне сістэм пастаянна патрабуе новых ведаў. Летась намі арганізавана і праведзена на прамысловых прадпрыемствах 11 семінараў, у гэтым годзе — пяць семінараў па тэме "Новая версія стандарту СТБ ISO 9001-2015. Асноўныя змены. Парадак пераходу, распрацоўкі і ўкаранення».

Можна сказаць, што вядучыя прадпрыемствы Гомельскага рэгіёна паспяхова ўкаранілі новую версію гэтага асноватворнага дакумента і пацвердзілі адпаведнасць у органе па сертыфікацыі — гэта значыць у нас. У іх ліку СП ААТ «Спартак», адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Гомельскі хімічны завод», «Гомельтранснафта Дружба», «Гомельжалезабетон», «Гомельбудматэрыялы», «Рагачоўскі МКК», «Гомельскі лікёра-гарэлачны завод «Радамір», мэблевая фабрыка «Прагрэс», а таксама прыватныя арганізацыі «Вытворчая арганізацыя Сябры», ВУП «Алкапак» і іншыя.

А **супрацоўніца аддзела Марыя ПАГОДЗІНА**, якая курыруе ўкараненне сістэмы НАССР, зрабіла свае ўдакладненне:

— У вобласці выдадзена каля 60 сертыфікатаў на сістэму НАССР у адпаведнасці з СТБ 1470, з іх 40 — органам па сертыфікацыі сістэм менеджменту нашага прадпрыемства. Мы акрэдытаваліся таксама на сістэму менеджменту бяспечнасці харчовых прадуктаў СТБ 22000 і ўжо з трыма прадпрыемствамі працуем па гэтай сістэме. А яна больш шырокая, чым НАССР, больш комплексная. Дзейнічае, як кажуць, «ад поля да відэльца». Сістэма рэгулюе і ўнясенне арганікі на палетткі, і нарыхтоўку кармоў, і іншыя сферы дзейнасці сельгаспрадпрыемстваў.

Нашы суразмоўнікі падкрэслілі неабходнасць выбудавання ў рэальным сектары своеасаблівага «ланцужка якасці», калі пастаўшчык зыходных матэрыялаў гарантуе вытворцу высокую якасць сыравіны, а гандаль — своечасовую рэалізацыю канчатковага прадукту ў сваёй сетцы.

**Начальнік аддзела па сертыфікацыі прадукцыі і паслуг Ала ЗАІЧКОВА**, што называецца, у тэму нядаўняга мерапрыемства расказала пра ўласны вопыт супрацоўніцтва з украінскімі прадпрыемствамі па ацэнцы адпаведнасці прадукцыі. Аддзелам былі праведзены работы і выдадзены сертыфікаты адпаведнасці на шчэбень вытворчасці заводаў з Оўруча і Карасценя на серыйную вытворчасць тэрмінам на пяць гадоў. Якасць пацвярджаецца пры правядзенні перыядычных ацэнак, выбраковак пакуль не было.

— Мы працуем таксама з харчовай прадукцыяй. З Украіны завозяцца шампіньёны, сіропы і напаўняльнікі, фруктовыя дабаўкі ды іншая прадукцыя, у тым ліку сельскагаспадарчая і лёгкай прамысловасці, упакоўка. Украіна не ўваходзіць у Еўразійскі эканамічны саюз, яны арыентуюцца на «еўраінтэграцыю», і ў іх дзейнічаюць свае нацыянальныя тэхнічныя рэгламенты. Таму працуем у рамках заканадаўства, як з імпартам. Правяраем на адпаведнасць нашым нацыянальным стандартам і рэгламентам. Адпавядае — выдаём сертыфікат. У суседзяў якасная прадукцыя, і мы заўсёды гатовы да супрацоўніцтва.

**Начальнік аддзела па выпрабаваннях харчовай і сельскагаспадарчай прадукцыі Антаніна ВЕРАМЕЕНКА** расказала пра новыя метады кантролю харчовай прадукцыі, яны дазваляюць вызначыць фальсіфікацыю малака і малочных прадуктаў, маслатлушчавай і алкагольнай прадукцыі. Новым кірункам у рабоце аддзела сталі і выпрабаванні вырабаў трыкатажнай і швейнай прамысловасці для дзяцей і дарослых, абутку, скураных і скургалантарэйных вырабаў. А таксама тары і ўпакоўкі па паказчыках бяспекі — міграцыі шкодных рэчываў, што вызваляюцца ў шэрагу выпадкаў самой упакоўкай.

У сувязі з узмацненнем канкурэнцыі на рынку прадуктаў усё большае значэнне набываюць арганалептычныя выпрабаванні, таму на базе аддзела створана і пачала функцыянаваць спецыяльная лабараторыя арганалептычнага аналізу, абсталяваная згодна з міжнародным стандартам ДАСТ ISO 8589 — 2014. Вядуцца распрацоўкі па ўдасканаленні сэнсорнага аналізу.

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**

УНП 400052222.

*Ад рэдакцыі. Выказваем шчырую падзяку намесніку дырэктара цэнтра Галіне Хамітаўне Кацубе за рознабаковую дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.*


Каманда цэнтра гатова да правядзення спартакіяды Дзяржстандарту.

# У КІТАІ ПАЧАЎСЯ КОНКУРС ПРЫГАЖОСЦІ «МІС СВЕТУ — 2018»

**Мінчанка Марыя Васілевіч падорыць удзельніцам сэрцайкі, зробленыя рукамі беларускіх дзяцей**

**Канкурсанткі амаль са 120 краін сабраліся сёння ў кітайскім горадзе Санья на адкрыцці найстарэйшага з форумаў прыгажосці ў свеце. Завершыцца ён грандыёзным фінальным шоу, якое пройдзе 8 снежня, а да гэтага ўдзельніц чакае напружаны месяц: экскурсіі, рэпетыцыі і фотасесіі, спартыўныя і творчыя спаборніцтвы, сацыяльна значныя праекты, афіцыйныя, дабрачынныя і асветніцкія мерапрыемствы, якія адлюстроўваюць галоўны пасыл конкурсу — «Прыгажосць з сэнсам».**


Фота Аляксея ІВАНЧАНКІ.

7 лістапада паляцела ў Паднябесную і сёлетняя «Міс Беларусь», мінчанка Марыя Васілевіч. Дзяўчына рыхтавалася да конкурсу вельмі адказна: на працягу трох месяцаў яна ўдасканальвала англійскую мову, наведвала ўрокі мастацтва, стылю, заняткі па псіхалогіі, макіяжы, фотапластыцы і дэфіле ў Нацыянальнай школе прыгажосці. З дапамогай выкладчыкаў універсітэта культуры і мастацтваў паставіла два танцы — народны, для агульнага выхаду «Танец свету», у якім кожная ўдзельніца прадэманструе культурны каларыт сваёй краіны, і фантазійны — як чароўная птушка Пава ператварылася ў прыгожую дзяўчыну — для конкурсу талентаў.

Аднак самым складаным, як жартавала напярэдадні ад'езду Марыя, аказалася не падрыхтоўка, а зборы: дзяўчына да апошніх дзён складала «тэтрыс», спрабуючы ўмясціць усё патрэбнае ў адведзеную норму: тры чамаданы па 23 кілаграмы. Ці гэта многа? Мяркуйце самі: акрамя паўсядзённага адзення і абутку, у багаж трэба ўмясціць каля 30 вячэрніх і кактэйльных сукенак для розных мерапрыемстваў, эксклюзіўныя ўборы, галаўныя ўборы і ўпрыгажэнні, якія стварылі беларускія дызайнеры Алена Гарэцкая, Юлія Латушкіна, Дар'я Мугака, Кацярына Плавінская і Антаніна Сурыновіч для конкурсных дэфіле, сувеніры для іншых удзельніц, а таксама некалькі купальнікаў. (Хоць з 2015 года арганізатары «Міс свету» і адмовіліся ад дэфіле ў бікіні, але спартыўныя спаборніцтвы, у тым ліку пляжны валейбол, ніхто не адмяняў, дый надвор'е самае што ні ёсць «купальнае»: сярэдняя тэмпература ў Саны 26—28 градусаў са знакам «плюс».)

— Шчыра кажучы, неяк упусціла пытанне акліматызацыі і да яе не рыхтавалася, — прызналася Марыя «Звяздзе». — Але думаю, што арганізм будзе мне толькі ўдзячны за дадатковы месяц лета. Што да змены часавых паясоў, у Кітаі будзе +5 гадзін да беларускага часу, і ў мяне ёсць літаральна дзень, каб больш-менш падладзіцца пад іншы рытм.

— Ведаю, што для будучых саперніц вы рыхтавалі адмысловыя падарункі: разам з навучэнцамі з інваліднасцю з Каменскай дапаможнай школы-інтэрната, што пад Бабруйскам, шылі з фетру сімпатычныя брошкі-сэрцайкі... Яны таксама трапілі ў багаж?

— Так, іх трэба было пашыць вельмі многа — 116 сэрцаў, але мы паспелі, і цяпер гэтыя ўпрыгажэнні як сімвал дабрыні і любові, спадзяюся, разляцяцца па ўсім свеце. А яшчэ дзеці зрабілі саламяных анёлаў, якіх я пакіну на памяць журы конкурсу.

Дарэчы, дабрачынны праект, які прэзентуе беларуска на «Міс свету», якраз звязаны з «асаблівымі» дзецьмі, магчымасцямі іх самавыяўлення і наогул сацыяльнай інтэграцыі ў сучасным свеце людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Прадстаўляць яго Марыі давядзецца ў адзіночку, як і рабіць усё астатняе: паводле ўмоў конкурсу, усе прыгажуні, кожная рангам не ніжэйшая за другую віцэ-міс сваёй краіны, знаходзяцца ў Кітаі без суправаджальнікаў і памагатых.

## Тым часам

На Філіпінах завяршыўся конкурс прыгажосці «Міс Зямля», які ладзіцца штогод з 2001 года. Удзел у ім сёлета прымалі дзяўчаты з 87 краін свету, а перамогу атрымала 23-гадовая студэнтка Фыёнг Кхань Нгуен з В'етнама.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

**Продавец:** ОАО «Лепельский ремонтно-механический завод», г. Лепель, ул. Партизанская, 2, тел. 8 (0232) 6-94-45

Лот №1. Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-8093 площадью – 2080,3 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – арочник, по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, 2Д (обременение – договор аренды до 02.05.2023 г.), расположено на земельном участке с кадастровым номером 222750100001005693 площадью 1,0326 га; Электрокранбалка опорная (на 12 опорах), грузоподъемностью 3,2 тонны, инв. № 399 с электротельфером Т10532. **Начальная цена**: 123 700,00 бел. руб. без НДС. Задаток: 12 370,00 бел. руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 21.11.2018 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 12.11.2018 с 8.30 по 20.11.2018 до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 20 (двадцать) календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: оплата НДС сверх цены продажи объекта. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 26.09.2018 г.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by



## ООО «Юридическая компания Аспект» проводит первые ТОРГИ в форме открытого аукциона по продаже движимого имущества Торгово-производственного частного унитарного предприятия «НАСТУРЦИЯ», находящегося в процедуре ликвидации

| № лота | Наименование лота | Начальная цена за лот без НДС, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| Имущество в ассортименте, новое и бывшее в употреблении (кухонная и офисная мебель, мебельная гарнитура, товары для дома, оргтехника и другое) согласно перечню, размещенному на сайте **www.nasturcia.by** | | Согласно данным сайта **www.nasturcia.by** | | |

*Торги состоятся **12.12.2018 г. в 10.00** по адресу г. Минск, ул. Панфилова, д. 2, пом. 49, оф. 6 (1-й этаж). Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **10.12.2018 г**. включительно. Заявки принимаются организатором по месту проведения торгов*

| | |
|---|---|
| Продавец | **Торгово-производственное частное унитарное предприятие «НАСТУРЦИЯ»** |
| Организатор торгов | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| Реквизиты для оплаты задатка | **Бенефициар – Торгово-производственное частное унитарное предприятие «НАСТУРЦИЯ», р/с BY61 BPSB 3012 1009 5001 8933 0000, ОАО «БПС-Сбербанк», ул. Уральская, 1А, Минск BIC: BPSBBY2X, УНН 100491810** |

**Условия торгов**

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;

лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением оригинал платежного документа с отметкой банка о его исполнении, подтверждающего внесение на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении, суммы задатка (задатков). При личном обращении заявитель (представитель) предъявляет оригинал документа, удостоверяющего личность. Дополнительно организатору торгов представляются:

– юридическом лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность на представителя или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом РБ): копии учредительных документов вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выданной не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, доверенность на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;

– ИП: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

– представителем гражданина Республики Беларусь, ИП: нотариально удостоверенная доверенность;

– представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

• победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;

• заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов;

• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретаемый предмет торгов;

• в случае если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов;

• победитель/единственный участник торгов, выразивший согласие на покупку предмет аукциона, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов, оплачивает цену лота **с учетом НДС по ставке 20 %** за вычетом суммы внесенного задатка, в течение 10 (десяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи, если иной срок для оплаты не определен соглашением сторон

**Получить дополнительную информацию о порядке проведения аукциона можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8 (017) 3480699**



Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**

• **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Калинковичский мясокомбинат», Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Северная, 8 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Липовский с/с, аг. Липов, ул. Советская, 26**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Здание комплексного приемного пункта** | 161,4 кв. м | 333/С-24121 |

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,0415 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания комплексного приемного пункта

**Начальная цена с НДС 20 % – 8 080,36 бел. руб.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 18.10.2018

**Аукцион состоится 22.11.2018** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 21.11.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37, 8 029 317-95-42; www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**



## Извещение об открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объекта (микрорайон «Южный-3» («Ольшанка-3») в г. Гродно 11 декабря 2018 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб. | Условие продажи и целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Право аренды земельного участка сроком на 50 лет | Микрорайон «Южный-3» («Ольшанка-3»), позиция по генплану № 89,90 | 0,3707 | 440100000001010595 | 87 526,58 | 8 750,00 | 4315,17 | Строительство торгового объекта (продовольственных и непродовольственных товаров) с объектом общественного питания (здание 1-2-этажное, переменной высоты, включает: продовольственный (универсам) и непродовольственный магазины с административными и вспомогательными помещениями, объект общественного питания (кафе), встроенную котельную) |

– земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: Паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

**Аукцион состоится 11 декабря 2018 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. с 12 ноября по 5 декабря 2018 года**. Телефон для справок в Гродно **(0152) 74-20-95, 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

# ЧЫМ ПАГРАЖАЕ САМАЛЯЧЭННЕ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



— Ва ўсіх гарачкапаніжальных парашках змяшчаюцца тры дзеючыя рэчывы, і ў большасці прэпаратаў дозы анальгіну або парацэтамолу вельмі вялікія. Аднаразовая доза парацэтамолу для дарослага чалавека павінна быць не большай за 300—350 міліграмаў, а ў адным з папулярных парашкоў ажно 750 міліграмаў. Гэта вялікая нагрузка на печань. Сімптомы лекі знімуць хутка, але тое, што вы не пажаўцееце да раніцы, гарантыі няма.

Людзям, якія пакутуюць на артэрыяльную гіпертэнзію і прымаюць апараты для зніжэння ціску, зноў жа, парашок можа моцна ўдарыць па нырках. Трэба ўлічваць, якія лекі прымаюцца паралельна.

**— Але ж не станеш звяртацца ў паліклініку па кожнай дробязі. Ну забалеў, напрыклад, жывот. Пайшоў сабе ў аптэку, купіў нешта абязбольвальнае...**

— Чалавек не можа правільна паставіць сабе дыягназ. Боль у жываце можа быць прыкметай як вострай хірургічнай паталогіі — апендыцыту, кішэчнага расстройства, банальнай дыскінезіі, так і інфаркту міякарда. Самалячэнне ў гэтым выпадку можа прывесці да сур'ёзных наступстваў. Вельмі часта людзі захапляюцца абязбольвальнымі прэпаратамі, або, як іх называюць прафесійна, — нестэроідамі. Напрыклад, забалела рука. Гэта можа быць сімптом нейкага артрозу або неўралгіі, а можа быць зноў такі ірадзіруючы боль пры інфаркце міякарду. Хворы ідзе ў аптэку па абязбольвальны сродак і толькі губляе час. Усё можа абярнуцца сур'ёзным ускладненнем і нават лятальным канцом.

**— У любога прэпарату звычайна шмат пабочных эфектаў. Як паменшыць ступень рызыкі? І наколькі яна павышаецца, калі лекі ўжываюцца без рэкамендацыі ўрача?**

— Вельмі часта бацькі купляюць сваім дзецям сасудазвужальныя сродкі ад насмарку — дэкангестанты. Але сёння сусветная асацыяцыя лор-урачоў не рэкамендуе іх выкарыстоўваць. Прапануюцца гарманальныя прэпараты, якія мякка ўплываюць на сасуды. А вось некаторыя папулярныя цяпер сродкі вельмі хутка могуць выклікаць у дзіцяці перадазіроўку, якая суправаджаецца брадыкардыяй. Гэта калі вельмі нізкі пульс, амаль спыненне сэрца. І такія дзеці рэгулярна ў асенне-зімовы перыяд паступаюць да нас у аддзяленне рэанімацыі. Небяспечным з'яўляецца і бескантрольны прыём гарачкапаніжальных сродкаў. Трэба ўжываць нешта адно. Але сёння на рынку зарэгістраваны прэпараты сумесныя, якія змяшчаюць і тое, і другое. Камбінаваныя формы гарачкапаніжальных прэпаратаў могуць выклікаць сур'ёзныя пабочныя эфекты, што закранаюць печань. Крайняе праяўленне — гэта сіндром Рэя, які вельмі цяжка лечыцца, і працэнт выздараўлення пасля яго вельмі малы. Такія дзеці могуць стаць кандыдатамі на трансплантацыю печані ў далейшым. Сітуацыя вельмі сур'ёзная, бо маленькія пацыенты з паражэннем печані таксама часта паступаюць да нас у бальніцу. Іх бацькі пачынаюць зніжаюць тэмпературу яшчэ да таго, як яна дасягнула 38 градусаў. А тэмпература — гэта добрая ахоўная рэакцыя, падчас якой гінуць мікробы.

**— Існуе меркаванне, што абараніцца ад грыпу можна, прымаючы прафілактычныя сродкі, маўляў, навошта наогул рабіць прышчэпку?**

— Яшчэ адзін сённяшні біч — гэта ўсе так званыя імунамадулятары, імунастымулятары, супрацьвірусныя прэпараты. На жаль, ніякай доказнай базы, што гэтыя прэпараты эфектыўныя пры віруснай або інфекцыйнай паталогіі, няма. Магчыма, можна было б і не звяртаць на іх увагі. Абы не шкодзілі. Але стабілізатары, якія ўваходзяць у іх (а ў леках яны заўсёды ёсць) наносяць сур'ёзны ўдар па нашай печані.

Самая галоўная абарона ад вірусаў і інфекцый — вакцынацыя. А яшчэ ў небяспечны перыяд лепш за ўсё пазбягаць месцаў вялікага збору людзей. Калі ўсё ж такі ідзяце туды, змажце нос «аксалінкай» — на дзве гадзіны вы дакладна абаронены.

Наогул, у грамадстве зараз вельмі актыўна займаюцца прафілактыкай не толькі грыпу. Напрыклад, вельмі часта — некалькі разоў на год — бацькі даюць дзецям таблеткі ад глістоў. Нават, калі ў доме ёсць жывёлы, гэта не значыць, што ў дзіцяці абавязкова будуць гельмінты, дастаткова гігіены — мыцця рук пасля кантакту з кошкамі-сабакамі. Што адбываецца з дзецьмі, якія бескантрольна прымаюць супрацьгельмінтныя прэпараты? Усе яны вельмі гепататаксічныя і ўяўляюць вялікую пагрозу для печані. Дзеці паступаюць да нас з сур'ёзнымі паказчыкамі пячоначных ферментаў, жаўтухай, павышэннем білірубіну.

**— Усе мы ведаем, што антыбіётыкі для нашага арганізма нешта накшталт цяжкай артылерыі. Наколькі можа быць небяспечным іх прыём без рэкамендацый урача?**

— На шчасце, большасць з іх сёння прадаецца па рэцэптах. Самалячэнне антыбіётыкамі — вельмі рызыкоўная справа. Людзі не ведаюць, што ўсе рэспіраторныя інфекцыі, больш за 80 % — вірусныя. А яны антыбіётыкамі не вылечваюцца. Наадварот, пры іх ужыванні прыгнятаецца імунная сістэма і арганізму становіцца цяжэй змагацца з вірусамі. Наогул, антыбіётыкі пры частым прымяненні могуць выклікаць такое захворванне, як антыбіётыка-асацыяваная дыярэя. Гэта сур'ёзнае захворванне страўніка, якое можа прывесці да страты крыві і зніжэння гемаглабіну, выклікаць ліхаманку. Такі хворы мае патрэбу ў працяглым аднаўленчым перыядзе.

**— Ці можа бескантрольнае выкарыстанне лекаў справакаваць нейкае сур'ёзнае захворванне, напрыклад анкалагічнае?**

— Анкалагічную паталогію правакуе звычайна не само рэчыва, а часцей за ўсё дабаўкі, якія выкарыстоўваюцца пры яго вырабе. Ва ўсіх леках ёсць пабочныя эфекты і самы страшны — гэта анафілактычны шок, той, які пагражае лятальным канцом. Але ў большасці лякарствы, якія прызначаюцца ў тэрапеўтычнай дазіроўцы, курсам, які трэба, не выклікаюць пабочных рэакцый. Максімум — гэта індывідуальная непераноснасць або нейкая алергічная рэакцыя.

**— А наколькі рызыкоўна бескантрольна ўжываць травы?**

— Травы — гэта біялагічна актыўныя дабаўкі. Як казаў старажытны філосаф: любое лякарства — атрута, любая атрута — лякарства, пытанне толькі ў дазіроўцы. Працяглы бескантрольны прыём без перапынку травяных прэпаратаў можа таксама выклікаць пабочныя эфекты. Напрыклад, звычайны святаяннік можа выклікаць разбурэнне клетак печані, рамонак — пашкоджанне слізістай страўнікава-кішачнага тракта, а мята — тахікардыю. Вядома, што гэта ўсё пры працяглым выкарыстанні. А вось у якасці сродку для далечвання якой-небудзь сур'ёзнай паталогіі травы, наадварот, прыносяць карысць. Тая ж рамонкавая гарбата пры прастудзе, адвар святаянніку пры хваробах страўнікава-кішачнага тракта. Але гэта павінен прызначыць урач.

**— Некаторыя насядаюць на травы з мэтай ачысціць арганізм ад шлакаў. Як вы гэта расцэньваеце?**

— Гэта наогул вар'яцтва. Наш арганізм — гэта вялікая біяхімічная прабірка, дзе ўсё расшчэпліваецца да монакампанентаў — бялкоў, тлушчаў, вугляводаў. Ніякіх адходаў не застаецца. Тыя ж чаі для пахудзення, якія вельмі папулярныя ў моладзі, выклікаюць мачагонны эфект і амаль цалкам вымываюць калій. Калі папіць чай тыдзень, катастрофы не адбудзецца, але да нас рэгулярна паступаюць дзяўчаты, замбіраваныя інтэрнэтам на прыгожыя фігуры, якія пастаянна п'юць такія напоі. У выніку адбываюцца абязводжанне і інтаксікацыя арганізма, парушэнне рытму сэрца.

**— Што трэба для таго, каб не ўзнікала жадання займацца самалячэннем?**

— Трэба павысіць доступ да ўрача. Для гэтага ў нас у краіне зараз праводзяцца сур'ёзныя рэформы ў выглядзе ўвядзення паняцця ўрача агульнай практыкі, які будзе сядзець, як той казаў, на скрынінгу, «фільтраваць» пацыентаў з іх праблемамі. А вось аптэк у нас занадта шмат. І на іх вітрынах вялікая колькасць прэпаратаў, у тым ліку гамеапатычных, травяных, якія не маюць доказнай базы. Чалавек прыходзіць і пачынае выбіраць сабе сам. Павінна быць больш высокая кваліфікацыя ў аптэчных работнікаў, каб яны маглі дыягнаставаць і адрозніваць банальны боль у жываце ад інфаркту міякарда. Павінны быць сур'ёзныя адукацыйныя праграмы, разлічаныя не на ўрачоў, а на грамадзян. Было б нядрэнна ўвесці і лекавае страхавое забеспячэнне. Гэта калі частка кошту выпісанага ўрачом лякарства вяртаецца да пацыента, і тады чалавек ахвотней будзе ісці да ўрача, каб яшчэ і сэканоміць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ВОСЕНЬ — ЧАС ІНФЕКЦЫЙ?

## Калі чакаць грып і як абараніцца ад адру

**Сезон вакцынацыі ад грыпу ў разгары, і ўсім, каму прышчэпка паказана, важна не спазніцца — яе пажадана зрабіць да снежня. Тым часам эпідэмія яшчэ адной небяспечнай інфекцыі — адру — у некаторых суседніх краінах працягваецца. Медыкі расказалі, калі сёлета чакаць прыход грыпу, як абараніць сябе ад адру і чаму ад захворвання часам не выратоўваюць прышчэпкі.**

### З-за сёлетняга цёплага надвор'я мы менш хварэем

Узровень вострых рэспіраторных інфекцый у Беларусі зараз на 16 % ніжэйшы, чым у гэты перыяд летась.

— Зараз у нас спакойная сітуацыя з віруснымі інфекцыямі, што, магчыма, у нейкай ступені звязана з цёплым для гэтай пары надвор'ем, — адзначыла **намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.** — Людзі сёлета больш актыўна робяць прышчэпкі ад грыпу. Ужо вакцыянаваны 21 % насельніцтва.

Як нагадала Іна Карабан, прышчэпку трэба рабіць у цалкам здаровым стане:

— Калі прышчапіцца нават з лёгкім насмаркам, імунітэт можа не выпрацавацца і не абараніць, калі арганізм сустрэнецца з вірусам, — растлумачыла спецыяліст.

Актывізацыі віруса грыпу ў гэтым сезоне медыкі традыцыйна чакаюць у канцы студзеня — пачатку лютага. Але не выключаюць, што яна можа ссунуцца на люты — сакавік.



— Улічваючы даныя па Паўднёвым паўшар'і, дзе асаблівых усплёскаў віруса грыпу не было, не чакаецца вялікага росту захваральнасці і ў Паўночным паўшар'і, — адзначыла Іна Карабан. — Новай пандэміі ў гэтым сезоне, хутчэй за ўсё, не будзе. З іншага боку, пасля апошняй прайшло дзевяць гадоў. І калі ўлічваць той факт, што новы вірус, які і выклікае пандэмію, з'яўляецца кожныя восем-дзесяць гадоў, то варта праявіць насцярожанасць і не пагарджаць прышчэпкамі.

**Загадчык кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Аксана РАМАНАВА** падкрэсліла, што і сярод дзяцей пад'ёму захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі, характэрнага для гэтага перыяду, не назіраецца.

— У дзіцячай інфекцыйнай бальніцы Мінска, дзе я практыкую, росту вірусных інфекцый няма. Няма і хворых на адзёр, — паведаміла Аксана Раманава.

### Адзёр не адступае

З лютага гэтага года, калі пачалі рэгістравацца першыя выпадкі адру, у Беларусі на яго захварэлі 241 чалавек ва ўсіх абласцях краіны, у тым ліку два чалавекі хварэюць зараз. Усе выпадкі заражэння — або завозныя, або кантактныя з тымі людзьмі, якія вярнуліся з-за мяжы. Хваробу прывозяць з Украіны, краін Еўропы і Егіпта.

— У суседніх краінах сёлета істотны ўздым захваральнасці. У бягучым годзе ў Еўропе зарэгістравана ўжо больш за 60 тысяч выпадкаў. Ад ускладненняў адру памерла 37 чалавек, у тым ліку 13 ва Украіне. Большасць выпадкаў была ў такіх краінах, як Сербія, Грэцыя, Італія, Францыя, Румынія, Украіна, Вялікабрытанія, Расія. Адзёр не абышоў і нашу краіну. Але выпадкі рэгістраваліся адзінкавыя, быў наладжаны пільны кантроль за ачагамі захворвання, вакцыянаваліся тыя, у каго адсутнічалі ці было недастаткова прышчэпак, — расказала Іна Карабан.

Сярод тых, хто захварэў на адзёр, 74 % не мелі прышчэпак. А вось у 26 % звесткі аб іх у амбулаторных картах былі.

— Імунная сістэма ў кожнага індывідуальная, і складана спрагназаваць, як яна адрэагуе на прышчэпку, выпрацуе ці не выпрацуе антыцелы. Да таго ж з часам імунітэт можа аслабляцца, калі прышчэпка рабілася даўно. У асноўным захворванне распаўсюджваецца сярод тых людзей, якія або ўвогуле не маюць, або маюць толькі адну прышчэпку, — растлумачыла Іна Карабан. — У выпадку з адром, калі менш за 70 % насельніцтва мае прышчэпкі, сітуацыя становіцца крытычнай.

### У Польшчу не пусцяць без прышчэпак?

У суседняй Польшчы міністэрства аховы здароўя прапанавала не пускаць у краіну тых, хто не мае прышчэпак ад адру. Пакуль гэта толькі прапанова, і якое рашэнне будзе прынята, невядома, але навіна прымусіла пахвалявацца тых, хто часта падарожнічае да суседзяў. Разам з тым Іна Карабан адзначыла, што адзёр, згодна з міжнароднымі патрабаваннямі і медыка-санітарнымі правіламі, не адносіцца да настолькі небяспечных інфекцый, каб уводзіць абмежаванні на ўезд. Але кожная краіна мае права прымаць тыя меры, якія лічыць неабходнымі, каб абараніць сваіх грамадзян.

— Для нашых грамадзян гэта будзе дадатковым стымулам паклапаціцца пра сваё здароўе і зрабіць прышчэпку, — адзначыла спецыяліст.

**Алена КРАВЕЦ.**

MINSK international film FESTIVAL LISTAPAD

# ЮБІЛЕЙ ПРАЙШОЎ НАРМАЛЬНА

## «Лістапад» назваў пераможцаў — усё вяртаецца ў звычайнае кола

**Поруч з салодкім зачараваннем кіно на «Лістападзе» заўсёды ідзе інтрыга — што і каго міжнародныя склады журы назавуць найлепшымі і з якімі фармулёўкамі. Учора на цырымоніі закрыцця 25-га Мінскага міжнароднага кінафестывалю ў кінатэатры «Масква» гэтае пытанне вырашылася: на сцэне былі названыя пераможцы сёлетняга форуму. Гран-пры «Золата «Лістапада» за найлепшы фільм атрымала румынская карціна «Мне пляваць, калі мы ўвойдзем у гісторыю як варвары» Раду Жудэ. Найлепшым дакументальным фільмам стала работа «Дамашнія гульні» Алісы Каваленкі капрадукцыі Украіны, Францыі і Польшчы. Ігравым пераможцам Нацыянальнага конкурсу стаў — не, не «Хрусталь» — фільм «Дачка» Мары Тамковіч.**


Кадр з фільма «Мне пляваць, калі мы ўвойдзем у гісторыю як варвары», што атрымаў «Золата «Лістапада».

### Цырыманіял

Узнагароджанне пачалося з уручэння прыза Прэзідэнта «За гуманізм і духоўнасць у кіно» — яго атрымала Наталля Мешчанінава, рэжысёр карціны «Сэрца свету», якая, дарэчы, аказалася адной з самых папулярных на фестывалі, гледзячы па аншлагу ў «Цэнтральным» і цікавасці да аўтаркі з боку прэсы. Акцёр фільма Сцяпан Дзявонін між іншым атрымаў ад журы Асноўнага конкурсу ігравога кіно на чале з рэжысёрам Юсупам Разыкавым таксама ўзнагароду «Найлепшая мужчынская роля». Фільм расказвае пра маладога ветэрынара, які жыве і працуе на трэніровачнай станцыі для паляўнічых сабак, што прыцягвае ўвагу абаронцаў правой


«Сэрца свету» Наталлі Мешчанінавай.

жывёл. Ён перажывае асабістыя драмы і жадае стаць блізкім сям'і ўладальніка станцыі. Наталля Мешчанінава ўжо ўдзельнічала ў «Лістападзе» са сваім фільмам «Камбінат «Надзея».

«Найлепшую жаночую ролю» на думку ўсё таго ж журы выкакала Чжаа Таа ў кітайска-французска-японскай карціне «Попел беласнежны». Яшчэ некалькі важных узнагарод прызначыў гэты склад экспертаў: за ўсё той жа «Попел беласнежны» яго рэжысёр Цзян Чжан-Кэ атрымаў узнагароду «Найлепшая рэжысура». «Найлепшым сцэнарыем» аказалася работа Огнена Главоніча, што стала асновай карціны «Груз». В'етнамская стужка «Трэцяя жонка» атрымала «Спецыяльны прыз журы».

Ну, а «Золата «Лістапада» — галоўны прыз 25-га Мінскага міжнароднага кінафестывалю — атрымала румынская карціна (а мы любім румынскі кінематограф) «Мне пляваць, калі мы ўвойдзем у гісторыю як варвары». Рэжысёр Раду Жудэ шчыра расказаў пра злачынствы румынаў падчас Другой сусветнай вайны. Румыны знялі фільм пра злачынствы румынаў, што — я толькі мяркую — магчыма, сыграла не апошнюю ролю ў вызначэнні пераможцы, бо для такога кшталту прызнанняў патрабуецца пэўная ментальная даросласць і смеласць.

У Асноўным конкурсе дакументальнага кіно Гран-пры атрымаў фільм «Дамашнія гульні» Алісы Каваленкі пра дзяўчыну з беднай украінскай сям'і, якая марыць прафесійна займацца футболам, але аддаць гэтаму жыццё ёй увесь час перашкаджаюць нешчаслівыя абставіны накшталт смерці маці. Спецыяльны прыз ад журы на чале з Міхалам Лешчылоўскім атрымала карціна «За межамі» Марты Прус, што паказала «ідэалагічны» бок расійскага вялікага спорту і жыццё мастацкай гімнасткі Маргарыты Мамун, закручанае вакол алімпійскага тытула.

Нацыянальны конкурс, аб якім сёлета віравала шмат абмеркаванняў з нагоды неўключэння ў адборачную камісію пры Міністэрстве культуры прадстаўнікоў дырэкцыі «Лістапада», выбраў найлепшыя ігравы, дакументальны і анімацыйны фільмы, а таксама прызначыў два дыпломы. Міжнароднае журы — у яго склад увайшлі адборшчык адной з секцый Венецыянскага кінафестывалю Рэната Сантора, фестывальны агент з Францыі Паскаль Рамонда і рэжысёрка Дар'я Юркевіч — сказалі, што найлепшай ігравой стужкай конкурсу з'яўляецца «Дачка» Мары Тамковіч, дакументальнай — «Песні для Кіта» Руслана Фядотава, анімацыйнай — «Лагодны воўк» Наталлі Дарвінай. Аўтары найлепшых ігравой і дакументальнай карцін атрымалі адукацыю і жывуць за мяжой. Яшчэ двума дыпломамі адзначана навела Мітрыя Сямёнава-Алейнікава з беларусфільмаўскага альманаха «Вайна. Застацца чалавекам» і Ігар Волчак за работу «Ваўчышка». Некаторыя лічылі шумную карціну «Хрусталь» Дар'і Жук безумоўным фаварытам (поўны метр і ўсё такое) і памыляліся: міжнароднае журы прафесіяналаў зрабіла свой выбар на карысць «Дачкі».

Журы FIPRESCI, якое функцыянуе на «Лістападзе» другі год, глядзіць дэбюты і вызначае ўладальніка прыза «Новыя галасы». Сёлета яны выбралі мексіканскую работу «Пакаёўка» Лілы Авілес.

### Надзённае

У апошнія дні «Лістапад» заправшаў паглыбіцца ў яго кіно (больш за 160 фільмаў) і быў больш святам, чым інфармацыйнай нагодай. Спадзяёмся, у прызёраў «Лістапада» будзе, як гэта часта здараецца, паспяховы далейшы фестывальны лёс альбо выдатная фільмаграфія. Але завяршэнне, уручэнне прызоў і раскрыццё галоўнай інтрыгі вярнула да рэальнасці і нагадала, у якім праблемным полі фестываль існуе апошні час.

Практыка тэндара на правядзенне чарговага форуму нівелюе высілкі дырэкцыі, дзякуючы якой «Лістапад» атрымаў статус міжнароднага кінафестывалю, акрэдытацыю Міжнароднай федэрацыі асацыяцый кінапрадзюсараў (FIAPF), запрасіў да ўдзелу Міжнародную федэрацыю кінакрытыкаў FIPRESCI, якая вызначае найлепшых у, скажам, Канах ці Берліне. Неабходнасць кожны год удзельнічаць у конкурсе Міністэрства культуры на права арганізаваць «Лістапад» робіць становішча дырэкцыі хісткім, не кажучы ўжо пра тое, што ўсе неабходныя працэдуры затрымліваюць паўнавартасную арганізацыю фестывалю.


Уладальнік Гран-пры за найлепшы дакументальны фільм «Дамашнія гульні».

Другое пытанне датычыцца, канешне, фінансаў, якіх на «Лістападзе», здаецца, становіцца ўсё менш і менш. Сціпласць бачная як у арыентацыі на аўтараў фільмаў у якасці «зорак», так і ў крытычна маленькім штаце, у якім некаторыя неабходныя пазіцыі папросту адсутнічаюць. Можна колькі заўгодна казаць на прэс-канферэнцыях, што з «Лістапада» трэба рабіць брэнд сусветнага ўзроўню і арганізоўваць такі кінафестываль, на які ўсе самі захочуць прыехаць, але на гэта патрэбны грошы. Дарэчы, на фестываль і без таго шмат хто хоча прыехаць — наколькі да Мінска даходзяць водгукі і каментары замежных калег, «Лістапад» і яго адбор маюць добрую рэпутацыю. Таму, калі часам я бачу на пляцоўках кінафестывалю незапоўненыя кіназалы і ўспамінаю, як часта даводзіцца чуць ад замежных калег пра выкшталцоны лістападаўскі адбор, становіцца шкада, што публіка, маючы ў руках нешта каштоўнае, гэта не шануе (так, на чырвоную дарожку «Лістапада» не прыязджае Катрын Дэнёў, але якія фільмы паказваюцца тут на вялікім экране).

Трэцяя праблема ўсплыла на другой прэс-канферэнцыі сёлетняга кінафестывалю — аказалася, у камісію пры Міністэрстве культуры, якая робіць фінальную фармацыю Нацыянальнага конкурсу, то-бок праграму беларускага кіно, не ўвайшлі прадстаўнікі дырэкцыі. У міністэрства няма прычын не давяраць прафесійнай дырэкцыі, якая перавяла «Лістапад», лічы, на новы ўзровень, і тут узнікае не адно пытанне.

Усё пералічанае, на жаль, іграе не на карысць фестывалю, хоць ён па-ранейшаму застаецца «святам, якое заўсёды з табой». 25-ы Мінскі міжнародны кінафестываль завяршыўся, кіно сышло з экранаў (нешта будзе паказана ў рамках «Лістапад. Калекцыя»), госці паехалі дадому. А пытанні засталіся.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

### НЕКАТОРЫЯ ІНШЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ КІНАФЕСТЫВАЛЮ:

**«Найлепшая аператарская работа імя Ю. А. Марухіна» ад журы Асноўнага конкурсу ігравога кіно адышла Адаму Баерскаму і Томашу Рафалу за польскі фільм «Аднойчы ў лістападзе».**

**У конкурсе «Маладосць на маршы» «Найлепшым фільмам імя кінарэжысёра В. Ц. Турава» сталі бразільска-партугальскія «Мёртвыя і іншыя», а «Спецыяльны прыз журы» атрымала карціна «Манта рэй» тайскага рэжысёра Пхуціпхонга Арунпхенга.**

**Прызы глядацкіх сімпатый размеркаваліся наступным чынам: у ігравым кіно больш за ўсё публіцы спадабалася «Юлі», у дакументальным — «Праект «Бабуля», у «Лістападзіку» — «Супа мода», што трапіў таксама ў лонг-ліст «Оскара».**

**Спецыяльны прыз Мінгарвыканкама атрымала карціна з Казахстана «Ласкавая абыякавасць свету» Адзільхана Ержанава.**

**Прыз «Саламяны зубр» Гільдыі кіназнаўцаў і кінакрытыкаў адышоў анімацыйнай рабоце «Беларусьфільма» «У Палессі на балоце».**

Культурная прастора

# КРОПЛЯ КАМЕНЬ КРЫШЫЦЬ?..

## У ТРАДЫЦЫІ МУСІЦЬ БЫЦЬ ПРАЦЯГ

**Больш за дваццаць фалькларыстаў, выкладчыкаў, вучоных Акадэміі навук, кіраўнікоў творчых аб'яднанняў і ўстаноў, даследчыкаў і практыкаў аўтэнтычнага беларускага мастацтва з усіх рэгіёнаў краіны сабраліся днямі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў за круглым сталом «Традыцыйная культура беларусаў: сучасны стан, праблемы захавання і развіцця». «Звязда» пабывала на маштабнай дыскусіі і паслухала, што трывожыць, а што выклікае спадзяванні на лепшае ў спецыялістаў па аўтэнтычнай культуры.**

«За апошнія тры дзесяцігоддзі ў краіне зроблена вельмі многае на падтрымцы фальклору і захаванні традыцыйнай культуры, — адзначае **старшыня Беларускага фонду культуры Тадэуш СТРУЖЭЦКІ**, — адроджаны практычна ўсе віды і кірункі народных рамёстваў, створаны сотні адметных творчых калектываў, дзейнічаюць раённыя цэнтры рамёстваў і фальклору, традыцыйнае мастацтва выходзіць на вялікія сцэнічныя пляцоўкі. Але неабходна прызнаць, што і страчана нямала, і з кожным годам скарачаецца колькасць носьбітаў традыцыйнай культуры, якія атрымалі яе з рук у рукі, з вуснаў у вусны ад бацькоў і дзядоў. А галоўнае, на мой погляд, — традыцыйная культура дагэтуль не мае шырокай запатрабаванасці ў грамадстве, яна часцей успрымаецца як дэкаратыўны элемент на разнастайных святах і фестывалях...»

Ці не з першых хвілін дыскусіі выявілася, што «тэарэтыкі» і «практыкі» глядзяць на праблемы захавання аўтэнтычнай беларускай культуры пад розным вуглом. Так, калі адны наракалі на недахоп спецыялістаў, якія маглі б адраджаць традыцыйныя фальклорныя кірункі, то другія ўказвалі на тое, што выпускнікі з дыпломамі фалькларыстаў аказваюцца незапатрабаванымі ў месцах размеркавання. Але і тыя, і другія пагадзіліся з высновай, што жыццяздольнасць фальклорнага мастацтва або традыцыйнага рамяства залежыць перадусім ад апантанага чалавека на месцы — ад кіраўніка калектыву, ад метадыста раённага ці абласнога цэнтра народнай творчасці... Некаторыя наракалі: маўляў, у кавярнях і па радыё не гучыць аўтэнтычная беларуская музыка, а другія даводзілі: «прышчапляць» народную культуру, спевы і танцы трэба не тое што са школы, а з дзіцячага садка. Дарэчы, пэўныя зрухі ў гэтай сферы ёсць. Напрыклад, расказвае **дырэктар Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра Святлана КАРЖУК**, абласное фальклорнае свята «Таночак» у вёсцы Бездзеж Драгічынскага раёна штогод збірае ўсё больш дзіцячых калектываў: калі спачатку іх было толькі тры, то цяпер ужо дзесяць — магчыма, дзякуючы ў тым ліку этнадыскатэкам, якія набіраюць папулярнасць у розных рэгіёнах як сярод дзяцей і падлеткаў, так і сярод моладзі і дарослых. Але, бадай, самы яскравы і заўважны прыклад вяртання да вытокаў, дыялогу пакаленняў праз традыцыйнае народнае мастацтва — унікальны фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня», які праходзіць у пасёлку Акцябрскім на Гомельшчыне з 1998 года. Кожны раз збіраюцца літаральна чэргі ахвотных у ім паўдзельнічаць, прычым гэта не толькі беларускія народныя майстры, рамеснікі, калектывы і выканаўцы, але і многа замежных гасцей. Разам з тым — «Берагіня» ў нас адна, і хоць кожны фестываль, не без гонару заўважыла яго **выканаўчы дырэктар, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама Святлана БЕРАЗОЎСКАЯ**, збірае са меней 800 (!) удзельнікаў з розных краін, але складанасці ў арганізацыі і фінансаванні творчага форуму выклікаюць насцярогу: ці адбудзецца наступны фэст, ці захавае ранейшую высокую планку, ці здолее развіваць надалей інфраструктуру для прыёму шматлікіх гасцей і ўдзельнікаў?..

«Трэба правесці мяжу паміж традыцыйнай культурай і стылізацыяй, бо жывыя абрады, спевы, танцы і сцэнічнае ўвасабленне «па матывах» — дзве зусім розныя рэчы», — адзначыў **загадчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ, удзельнік Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Вячаслаў КАЛАЦЭЙ**. Каб даць адчуць гэту розніцу на практыцы, сваіх уласных студэнтаў Вячаслаў Віктаравіч у абавязковым парадку ўжо на першым курсе «акунае» ў фальклорную экспедыцыю, а дыпломны праект яны мусяць абараніць там жа, дзе збіралі матэрыял, — і галоўны экзамен у тым, ці прымуць гэту здачу самі носьбіты беларускіх традыцый.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Супрацоўнік Любанскага раённага цэнтра культуры, кіраўнік узорнага фальклорнага гурта «Верабейкі» Сяргей ВЫСКВАРКА** падтрымаў калегу і падкрэсліў, што лічыць вельмі важным не толькі захоўваць традыцыйную культуру ўнутры краіны, але і дэманстраваць яе на замежных фальклорных фестывалях, «каб і ў свеце паказваць нашу адметнасць, і ў самім сябе выхоўваць павагу да аўтэнтыкі, што гэта не «Манька з кута», а шаноўная спадарыня Марыя». Тым больш запыты звонку ёсць: як расказаў **начальнік аддзела народнай творчасці Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Аляксандр ЛОЗКА**, налета Славенія, Швейцарыя, Партугалія, Германія ўжо запрашаюць да сябе аўтэнтычныя беларускія калектывы. Але зноў жа, для фальклорных гуртоў такі «банкет» за свой кошт абыдзецца занадта дорага, а з падтрымкай, у тым ліку фінансавай, ёсць пытанні.

У 90-я гады мінулага стагоддзя, нагадала **навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Алена БОГАНЕВА**, існавала праграма дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры, дзякуючы якой дапамога накіроўвалася на патрэбы канкрэтнага Дома рамёстваў або музея. Зрэшты, і сёння ёсць прыклады адраснай падтрымкі: так, сёлета некаторыя беларускія народныя траўніцы і рэгіянальныя цэнтры, якія займаюцца лекаваннем зёлкамі, атрымалі сертыфікаты і прэміі дзякуючы праграме, у якой удзельнічае Інстытут генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі.

Але перадусім, упэўнены **старшыня Асацыяцыі майстроў музычных інструментаў Віктар КУЛЬПІН**, кожны, хто працуе ў рэчышчы традыцыйнай культуры, мусіць не чакаць падтрымкі зверху, а пачынаць з сябе: «Фальклор — гэта крыніца, якая дае натхненне вялікаму мноству людзей — выканаўцаў, калектываў, майстроў. А які прадукт мы выдаём назад, каб падсілкоўваць гэту крыніцу, — хоць па шклянцы налілі ў яе альбо цалкам нармальна працуем на полі масавай культуры, якая корміць і поіць творцаў?..»

Многія ўдзельнікі круглага стала гаварылі пра адсутнасць адзінага цэнтра, які каардынаваў і абагульняў бы дзейнасць асобных устаноў, што займаюцца захаваннем нацыянальнай культуры, удасканальваў механізмы іх узаемадзеяння і дазваляў рабіць існуючыя мерапрыемствы больш глабальнымі. Таксама спецыялісты абмяркоўвалі неабходнасць прыняцця асобнай дзяржаўнай праграмы «Традыцыйная культура і моладзь Беларусі» на 2021—2025 гг. (Гэта пытанне, дарэчы, востра стаіць не толькі ў Беларусі, і сёлета на Еўразійскім гуманітарным форуме па пытаннях культуры і народнай творчасці прадстаўнікі 60 краін свету абмяркоўвалі яго напярэдадні Сусветнай фальклорыяды — 2020.) Сярод іншых агучаных прапаноў — стварэнне Беларускага саюза фалькларыстаў, унясенне Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» ў нацыянальны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, стварэнне і якаснае напаўненне папулярнага сайта «Традыцыйная культура Беларусі», аб якім вядзецца гаворка ўжо доўгі час, і г. д. Рэзалюцыю, прынятую па выніках круглага стала, яго арганізатары перадалі на разгляд у Мінкультуры і Мінадукацыі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Сугучча

# БЯЛГРАДСКІ ВОПЫТ ДЛЯ МІНСКА

**Дэлегацыя беларускіх кнігавыдаўцоў наведала 63-ю Бялградскую міжнародную кніжную выстаўку, дзе прадставіла шматлікія навінкі. А таксама пераняла карысны вопыт калег, які добра было б укараніць і на айчынным глебе.**

«Бялградская кніжная выстаўка — адна з самых старых у Еўропе, — расказаў **намеснік дырэктара «Выдавецкага дома «Звязда», галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Аляксей ЧАРОТА**. — Сёлета яна праходзіла 63-і раз. Удзел прынялі 488 выдавецтваў, з іх 393 — мясцовыя, сербскія, і 95 — замежныя выдавецтвы, сярод якіх былі і беларускія. Сёлета выстаўку наведала 195 тысяч чалавек. І гэта пры тым, што ўваход платны — каштуе каля двух еўра».

На выстаўцы былі прадстаўлены беларускія кнігі, перакладзеныя Даянай Лазарэвіч на сербскую (дарэчы, такіх спецыялістаў няшмат), — гэта творы Віктара Казько, Алеся Карлюкевіча, а таксама зборнік «Вянок» Максіма Багдановіча.

**Дырэктар выдавецтва «Народная асвета» Вікторыя КАЛІСТРАТАВА** падзялілася ўражаннямі:

— Мяне, як выдаўца, які выпускае кнігі шрыфтам Брайля, здзівіла тое, што ў Нацыянальнай бібліятэцы Сербіі маецца асобная зала для невідушчых чытачоў. Гэта зала была адкрыта ў 2011 годзе. Да яе па ўсёй тэрыторыі бібліятэкі пракладзена спецыяльная рыфленая дарожка. План бібліятэкі таксама пададзены спецыяльным рэльефным спосабам, каб яго можна было прачытаць рукамі. Такая зала ў Сербіі — адзіная. А ў нашай Нацыянальнай бібліятэцы такой залы для невідушчых, па маіх звестках, пакуль няма.

Беларускія выдаўцы звярнулі ўвагу, што выстаўку ў Бялградзе наведала вельмі шмат школьнікаў і студэнтаў. Яны былі вельмі ўражаныя, калі пабачылі вялізную плошчу, застаўленую двухпавярховымі аўтобусамі... Дзеці прыязджалі цэлымі класамі не толькі са сталіцы, але і з усёй Сербіі. А вярталіся з пакункамі ў руках, у якіх ляжалі кнігі.

Кнігавыдаўцы плануюць звярнуцца да Міністэрства адукацыі і Міністэрства інфармацыі Беларусі з прапановай, каб былі разасланы рэкамендацыйныя лісты з прапановамі наведвання школьнікамі Беларусі Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі.

— У вялікай колькасці выстаўку наведалі людзі з абмежаванымі магчымасцямі — інваліды-калясачнікі і дзеці з асаблівасцямі інтэлектуальнага развіцця, у тым ліку з ДЦП, — дадала Вікторыя Калістратава. — Чаму ў нас мы не бачым такіх людзей на мерапрыемствах?.. Хацелася б, каб Мінская міжнародная кніжная выстаўка таксама магла прымаць людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Разам з выдаўцамі выстаўку наведаў таксама і **пісьменнік, настаўнік беларускай мовы і літаратуры Вілейскай гімназіі № 2 Віктар КАЖУРА**:

— Працуючы на стэндах, размаўляючы па-беларуску, я заўважыў, што сербы прыслухоўваліся і — усё разумелі! Адразу падыходзілі, дзякавалі, казалі пра сяброўства нашых краін... Вельмі па-добраму ўразіў філалагічны факультэт Бялградскага ўніверсітэта, дзе ёсць беларускае аддзяленне і студэнты вывучаюць беларускую мову. Калі яны пабачылі верш Янкі Купалы «А хто там ідзе?» у перакладзе на сербскую, былі проста ў захапленні. І чыталі гэты верш на надзвычай высокім мастацкім узроўні. А на беларускай мове ўвогуле яны гавораць даволі бегла.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# «Акадэмкніга»: лідар продажаў

**Пра Віктара Марціновіча спрачаюцца, хтосьці нават выказвае меркаванні пра яго творчасць, не чытаючы яго тэкстаў, а тым часам яго кнігі разыходзяцца па Беларусі і свеце вялікімі тыражамі. На крайні выпадак — у параўнанні з тымі кнігамі, якіх за год набываюць у айчынных кнігарнях па 10—20 асобнікаў.**

Сведчанне папулярнасці празаіка — і нядаўняя гандлёвая акцыя ў кнігарні «Акадэмкніга», дзе прайшла аўтограф-сесія Віктара Марціновіча. Размова пра раман «Ноч», які толькі што выйшаў у «Кнігазборы» на беларускай мове (кніга па-руску павінна выйсці праз некалькі месяцаў), вялася хіба што толькі ў кулуарах мерапрыемства, бо сам аўтар толькі і паспяваў надпісваць кнігу пакупнікам. Усяго, расказваюць у «Акадэмкнізе», у дзень аўтограф-сесіі было прададзена 300 асобнікаў. Лічба ўражвае. Яна прыблізна роўная лідарам рэйтынгаў продажу ў сістэме «Белкнігі», дзе, праўда, працуюць амаль 100 кнігарняў.

Дарэчы, агульны наклад рамана «Ноч» у выданні на беларускай мове — 2300 асобнікаў, з іх 300 — у цвёрдым пераплёце, 2000 — у мяккай вокладцы.

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.**

# ЗАКЛАДНІКІ «ВЯСНЫ»

## Што адбываецца ў Тунісе?



**На мінулым тыдні ў туніскай сталіцы падарвала сябе тэрарыстка-смяротніца. У выніку пацярпелі дзевяць чалавек, у асноўным гэта былі супрацоўнікі праваахоўных органаў. «Жанчына пакінула горад Махдзі і сказала сваёй сям'і, што едзе ў сталіцу для пошуку працы. У яе ўніверсітэцкая ступень у галіне англійскай мовы», — паведаміў пра смяротніцу супрацоўнік міністэрства ўнутраных спраў краіны. Выбух адбыўся на цэнтральнай плошчы Туніса, каля муніцыпальнага тэатра і французскага пасольства.**

**Гэта адно са знакавых месцаў сталіцы паўночнаафрыканскай дзяржавы. Тут заўжды шмат турыстаў і час ад часу ладзяцца рознага роду маніфестацыі. Адметна, што менавіта на плошчы імя Хабіба Бургібы распачалася хваля народных пратэстаў, у выніку якіх у 2011 годзе быў зрынуты тагачасны лідар краіны, і пачалася «арабская вясна». Паводле даных інфармагенцтва Reuters, улады Туніса афіцыйна пацвердзілі, што самападрыў меў тэрарыстычную скіраванасць, а выканаўца і яе настаўнікі звязаны з джыхадысцкім падполлем, якое дзейнічае ў дзяржаве.**

**У СМІ раней гучалі неафіцыйныя здагадкі пра тое, што выбух магла зладзіць тэрарыстычная групоўка «Ісламская дзяржава». Відавочна, што ў краіне заўважна ўзрос узровень небяспекі. Чаму «ліхаманіць» Туніс?**

### НА ЎЗГОР'І АТЛАСА

Крыху «навігацыі». Туніс на поўначы і ўсходзе абмываецца Міжземным морам, на захадзе мяжуе з Алжырам, на паўднёвым усходзе — з Лівіяй. Каля паловы плошчы краіны займаюць усходнія тэрыторыі гор Атлас, астатняя частка пакрыта саванамі і ў асноўным пустынная. У 1705-м была створана незалежная дзяржава Туніс пад уладай беяў з дынастыі Хусейнідаў, якія прызнавалі султана толькі рэлігійным лідарам. У 1881—1883 гадах Францыя навязала Тунісу пратэктарат, уцягнуўшы яго ў склад сваёй каланіяльнай імперыі. У 1957-м манархія была ліквідавана. А з пачатку 1960-х у краіне дэ факта ўсталяваўся аднапартыйны рэжым партыі Новы Дустур, пераназваной у 1964 годзе ў Сацыялістычную дустураўскую партыю.

У 1987-м у краіне адбылася Язмінавая рэвалюцыя — прэзідэнт краіны Хабіб Бургіба быў зрынуты прэм'ер-міністрам Бэн Алі са згоды ўсіх ключавых міністраў і сілавых ведамстваў. У наступным годзе ў Тунісе былі праведзены абмежаваныя рэформы. Кіраўніцтва краіны здолела перайсці ад аднапартыйнай сістэмы да фармальна шматпартыйнай, пазбегнуўшы магчымых на такім шляху цяжкіх наступстваў і не страціўшы руль кіравання. Туніс праводзіў празаходнюю палітыку, змагаючыся з ростам ісламскага фундаменталізму.

Аснову эканомікі краіны традыцыйна складае сельская гаспадарка. Другое месца ў нацыянальным даходзе займае турызм, трэцяе — лёгкая прамысловасць, у асноўным тэкстыльная. Па экспарце алівак і алівкавага алею Туніс займае чацвёртае месца ў свеце. У краіне налічваецца больш за 50 мільёнаў алівкавых дрэў. Туніс забяспечвае да 10 працэнтаў сусветнай вытворчасці алівкавага алею. Але іншай сельскагаспадарчай прадукцыі вырабляецца недастаткова, і краіна вымушана яе імпартаваць. Буйныя радовішчы фасфарытаў распрацоўваюць дзяржаўныя кампаніі. Здабыча нафты складае пяць мільёнаў тон, гэта забяспечвае ўнутраныя патрэбы краіны і дае да 40 працэнтаў экспартнай выручкі. Доўгі час «чорнае золата» было асноўнай крыніцай экспартных паступленняў Туніса. З канца 1980-х гэтая роля перайшла да тэкстыльных вырабаў і харчавання.

### ДРУГАЯ ЯЗМІНАВАЯ

На працягу 2000-х у краіне дынамічна развівалася эканоміка. Напрыклад, аб'ём ВУП па парытэце пакупной здольнасці за 2011 год склаў звыш 100 мільярдаў долараў (каля 9500 долараў на душу насельніцтва). Як вызначалі тагачасныя апытанні, амаль палова насельніцтва адносіла сябе да сярэдняга класа. Але ўсё змянілася. Як вядома, у снежні 2010 года распачалася «арабская вясна», калі туніскі актывіст здзейсніў самаспаленне ў сталіцы дзяржавы, запусціўшы тым самым масавыя хваляванні. У выніку дэманстрацый ужо да сярэдзіны студзеня наступнага года абярнуліся звяржэннем афіцыйнага ўрада — прэзідэнт Зін Аль-Абідзін Бен Алі і члены яго сям'і былі вымушаныя збегчы з Туніса. Гэтыя падзеі назвалі другой Язмінавай рэвалюцыяй.

З тых часоў на пасадзе кіраўніка дзяржавы змяніліся чатыры палітыкі, але стабільнасць у гэтую краіну так і не вярнулася, лічаць эксперты турэцкага Цэнтра стратэгічных даследаванняў Kafkassam. Наадварот, адзначаліся самыя маштабныя акцыі пратэсту з моманту 2011 года. У шэрагу населеных пунктаў паліцэйскім прыйшлося прымяніць слезацечны газ, каб разагнаць дэманстрантаў. Каля 800 чалавек, якія падазраюцца ў гвалце, марадзёрстве і вандалізме, былі арыштаваныя, прыкладна 100 супрацоўнікаў праваахоўных органаў атрымалі раненні. Тады палітолагі і загаварылі аб вяртанні «арабскай вясны» на радзіму — у Туніс.

Пры гэтым за апошнія сем гадоў тэрарыстычная актыўнасць у краіне не памяншалася: баевікі час ад часу падкрэслівалі сваю прысутнасць і ў гэтай краіне, здзяйсняючы гучныя тэракты, адказнасць за якія нязменна брала на сябе «Ісламская дзяржава». Найбольш буйныя трагедыі адбыліся ў першай палове 2015 года. Гэта майскі напад на музей Брага ў сталічных ваколіцах, падчас якога загінула больш за 20 чалавек. А ў чэрвені адбыўся расстрэл турыстаў у курортным горадзе Сусе. Тады ахвярамі ісламістаў стала больш за 70 чалавек.

Гэтыя два найбольш рэзанансныя тэракты абвалілі эканоміку Туніса, якая моцна залежыць ад турызму. На наступны год радыкальныя ісламісты, арыентуючыся на групоўкі з суседняй Лівіі, здзейснілі няўдалую спробу захапіць прыгранічны горад каля мяжы з былой «Джамахірыяй лівійскага народа». Улады рэзка ўзмацнілі барацьбу з тэрарызмам і рэлігійным экстрэмізмам, і да апошняга часу сур'ёзных тэрактаў у Тунісе не было. Праўда, сітуацыя з бяспекай замежных турыстаў была і застаецца ў гэтай краіне вельмі напружанай, у тым ліку і з-за блізкага суседства з ахопленай грамадзянскай вайной Лівіяй, і з насычаным ісламісцкімі групоўкамі Алжырам. Акрамя таго, нямала прыхільнікаў тэрарыстычнай арганізацыі знаходзіцца і ў самім Тунісе: у рэйтынгу Soufan Group гэтая зусім невялікая паўночнаафрыканская краіна заняла чацвёртае месца па пастаўках кадраў у ІД ва ўсім свеце.

### ШЛЯХ ПА МІЖЗЕМНЫМ МОРЫ

У Тунісе рэзка падае нараджальнасць. У 2010-м сумарны каэфіцыент фертыльнасці ацэньваўся ў 1,71 дзіцяці на жанчыну. Гэта самы нізкі паказчык сярод арабскіх краін, і ён працягвае змяншацца. Сёння колькасць насельніцтва складае каля 10 мільёнаў чалавек. Пераважная большасць з іх (98 працэнтаў) вызнаюць іслам. Адмоўную дэмаграфію ўзмацняе масавая міграцыя.

Паводле статыстыкі, у 2016-м краіну пакінулі 1200 бежанцаў. Праз год — ужо больш за 6000 чалавек. Сёлета толькі за першае паўгоддзе краіну спрабавалі пакінуць 2500 тунісцаў. Пры гэтым, толькі па афіцыйных даных, ужо вядома аб 100 загінулых у караблекрушэннях мігрантах. Так, у чэрвені гэтага года ратавальнікі паднялі 37 цел нелегалаў, якія патанулі каля ўзбярэжжа Туніса, 68 чалавек удалося выратаваць. Жаданне пакінуць краіну, у якой у бежанцаў няма ніякай магчымасці зарабіць хоць нейкія грошы, не знікае нават пад пагрозай смерці. Так, у жніўні ў Сфаксе пры сутыкненні ваенных і мігрантаў загінула па меншай меры чатыры чалавекі. Нелегалы паспрабавалі даць нацгвардыі адпор і закідалі іх «кактэйлямі Молатава».

### ДАЙЦЕ ПРАЦУ ЦІ ЗАБІЦЕ!

Банкаўскія пазыкі сталі «традыцыяй» сем'яў Туніса, піша AlAraby. Нізкія заробкі і высокія цэны з'яўляюцца асноўнымі прычынамі, з-за якіх тунісцы бяруць крэдыты. Аб гэтым сведчаць вынікі даследавання Нацыянальнага інстытута дзяржаўнага спажывання. 36,5 працэнта апытаных тунісцаў маюць аднаго сваяка, які плаціць банкаўскі крэдыт. У 10,3 працэнта рэспандэнтаў крэдыт плацяць два члены сям'і. 19,6 працэнта з іх жывуць за кошт банкаўскіх пазык. Агульны аб'ём крэдытаў, атрыманых сем'ямі са снежня 2010 года па чэрвень 2018-га, павялічыўся на 117 працэнтаў і склаў 23,1 мільярда дынараў (8,5 мільярда долараў). Адзначаецца, што каля 540 тысяч сем'яў апынуліся ў крэдытнай яме, паколькі бяруць пазыкі, каб пагасіць папярэднія. 80 працэнтаў гэтых крэдытаў з'яўляюцца доўгатэрміновымі або сярэднетэрміновымі, тэрмін іх пагашэння складае ад 15 да 20 гадоў. На думку экспертаў, рост спажывецкіх крэдытаў з'яўляецца непазбежным вынікам зніжэння пакупной здольнасці.

Як стала вядома, Міжнародны валютны фонд прыняў рашэнне аб выдачы краіне новага траншу. МВФ мяркуе даць Тунісу 250 мільёнаў долараў фінансавай дапамогі. Аднак, лічаць эксперты, гэтыя сродкі наўрад ці дапамогуць Тунісу пераадолець глыбокі эканамічны крызіс. У краіне працягваецца рост узроўню інфляцыі і падзенне рэальных даходаў мясцовага насельніцтва. «Людзі сёння зноў выходзяць на вуліцы краіны і патрабуюць працы, заробкаў і хоць бы элементарных умоў жыцця», — расказаў rueconomics.ru дырэктар Інстытута стратэгічных даследаванняў Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў Дзмітрый Ягорчанка. Лозунгі на маніфестацыях гучаць не інакш як «дайце працу ці забіце!». На думку эксперта, рост напружанасці ў грамадстве можа абярнуцца новай хваляй пратэстаў, якія заўсёды прыцягваюць рэлігійных экстрэмістаў і тэрарыстаў. У выніку чаго краіна мае ўсе шанцы ператварыцца ў адно з найвагаміцейшых апірышчаў міжнароднага тэрарызму ў рэгіёне.

Днямі стала вядома, што прэзідэнт Туніса Бэджы Каід ас-Себсі вырашыў падоўжыць рэжым надзвычайнага становішча па ўсёй краіне да 6 снежня. Перад гэтым кіраўнік дзяржавы правёў сустрэчу з міністрамі абароны і ўнутраных спраў для ацэнкі сітуацыі ў сферы бяспекі ў краіне, а таксама пагроз з боку тэрарыстычных арганізацый і груповак, паведамляе «Сіньхуа». Як вядома, рэжым надзвычайнага становішча ў Тунісе быў абвешчаны тры гады таму — у лістападзе 2015-га, пасля таго як тэрарыст-смяротнік здзейсніў атаку на прэзідэнцкую гвардыю. Пакуль прыгожая краіна насамрэч застаецца закладніцай «арабскай вясны».

**Захар БУРАК.**


**РУП «Торговый дом «Восточный»
извещает о проведении 12.12.2018 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества**

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-126695 общей площадью 63,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Воровского, 31-74. Назначение: административно-торговое помещение, наименование: изолированное помещение. **Начальная цена продажи – 79 020,00 руб., задаток – 7 902,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-124822 общей площадью 54,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Воровского, 31-76. Назначение: административно-торговое помещение, наименование: изолированное помещение. **Начальная цена продажи – 68 310,00 руб., задаток – 6 831,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-124823 общей площадью 64,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Воровского, 31-77. Назначение: административно-торговое помещение, наименование: изолированное помещение. **Начальная цена продажи – 80 100,00 руб., задаток – 8 010,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Капитальное строение с инвентарным номером 333/С-53083 общей площадью 830,6 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Советская, 4/3. Назначение: здание арочника, наименование: одноэтажное кирпичное метало-каркасное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 322350100001000159 площадью 10,8010 га. **Начальная цена продажи – 106 812,00 руб., задаток – 10 681,20 в руб. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Капитальное строение с инвентарным номером 721/С-400 общей площадью 51,7 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Дрибинский р-н, Коровчинский с/с, д. Полуи. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: одноквартирный жилой дом Расположено на земельном участке с кадастровым номером 722380204101000004 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 1 530,00 руб., задаток – 153,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ

**Аукцион состоится 12.12.2018 в 14.00 по адресу:
г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 12 декабря 2018 года.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений 07.12.2018 в 14.00.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменном указанию Департамента в любое время до объявления его проданным**

**Контакты организатора аукциона:
+375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63**



**Извещение о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221281205101000138 площадью 0,1491 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Поляи, ул. Луговая, У-5, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: отсутствуют. **Нач. цена**: 8 000,00 бел. руб. **Задаток:** 800,00 бел. руб. |
| Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 221281201101000532 площадью 0,1495 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Солнечная, У-8, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона реки, водоема (оз. Полонское), охранная зона электрических сетей свыше 1 000 В. **Нач. цена**: 8 000,00 бел. руб. **Задаток:** 800,00 бел. руб. |
| Лот № 3. Земельный участок с кадастровым № 221281201101000533 площадью 0,1483 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Солнечная, У-7, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона реки, водоема (оз. Полонское), охранная зона электрических сетей до 1 000 В. **Нач. цена**: 8 000,00 бел. руб. **Задаток:** 800,00 бел. руб. |
| Лот №4. Земельный участок с кадастровым № 221281201101000531 площадью 0,1201 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Светлая, У-1, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона реки, водоема (оз. Бернское), охранная зона электрических сетей до 1 000 В. **Нач. цена**: 8 000,00 бел. руб. **Задаток:** 800,00 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 11.12.2018 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 10.11.2018 с 8.30 по 10.12.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY89AKBB36003140200420000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Вороновский сельсовет). Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь) |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем.участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией прав на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий двух лет; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем.участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

## Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гродно Рембыттехника» 11 декабря 2018 года

| Вид аукциона открытый | Лот № 1* |
|---|---|
| Предмет аукциона | капитальное строение с инвентарным номером 401/С-19599, здание специализированное для бытового обслуживания населения (пункт проката) общей площадью 77,5 кв. м. Год постройки – 1962 |
| Начальная цена продажи | **23 121,50 рубля** (с учетом НДС 20 %) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 422050400002002348, 0,0141 га |
| Месторасположение земельных участков | Гродненская область, г. Скидель, ул. Интернациональная, д. 41А |
| Имущественное право земельных участков | право постоянного пользования |
| Продавец | **открытое акционерное общество «Гродно Рембыттехника», г. Гродно, переулок Виленский, д. 16, тел. 771479** |
| Сумма задатка | **1 156,08 рублей** |
| Организатор аукциона | коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел. 720537, 720546 |
| Дата проведения аукциона | **11 декабря 2018 года** |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 |
| Дата и время начала приема документов | 12 ноября 2018 года, 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 5 декабря 2018 года, 17.00 |

*объект обременен договорами аренды.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Открытое акционерное общество «Стеклозавод «Залесье» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

1. Недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская область, Вилейский район, п. Партизанский, ул. Ломоносова, 10, в составе:

**Лот № 1** административно-бытовой корпус – 1827,5 кв. м; **лот № 2** составной цех – 1526,9 кв. м, **лот № 3** главный производственный корпус – 3097,2 кв. м; **лот № 4** компрессорная станция – 263,9 кв. м, **лот № 5** склад ГСМ – 15,1 кв. м, **лот № 6** заправочная – 24,2 кв. м, **лот № 7** склад для мазута – 62,9 кв. м, **лот № 8** насосная станция – 15,8 кв. м, **лот № 9** насосная станция – 24,0 кв. м, **лот № 10** гараж – 859,1 кв. м; **лот № 11** проходная – 16,5 кв. м; **лот № 12** контора – 260,1 кв. м; **лот № 13** склад готовой продукции – 201,4 кв. м;

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах, а также подробная информация об имуществе оговорены в условиях его проведения, размещенных на сайтах:

1) www.minsk-region.gov.by в разделе Работа с инвесторами «Одно окно» (Раздел 5. Аукционы по продаже недвижимости), 2) www.vileyka.minsk-region.by, 3) www.peramoga.by

Аукцион состоится **28.11.2018 г.** в 11.00 по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. 17 Сентября, д. 32. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 26.11.2018 г.** в рабочие дни до 15.00 по указанному адресу. Тел.: +375 29 6853677, 801771 5-24-84.

УНП 600010636

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:

– квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ № 0199310, 0199312, 0562131, 2277090;

– полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1440233, 1440349, 1509941, 1511045, 1517471, 1518716, 1518721, 1525547, 1525619, 1538131, 1538157, 1614389, 1641478, 1641790, 1641798, 1669366, 1669530, 1669629, 1692425, 1692558, 1730819, 1730820, 1738725, 1756589;

– полис «Добровольное страхование имущества физических лиц; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир» формы 2РН, 2РП серии БИ № 0041744. УНП 100782388

## Извещение о проведении 17 декабря 2018 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе) | «Здание административно-бытового корпуса с ремонтным цехом» общей площадью 1680,9 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-56395), в том числе забор ж/б (инв. № 2002039), ограждение склада металла с воротами металлическими (инв. № 2002080), сетчатый забор на металлических столбах (инв. № 2002081), ворота раздвижные с переносной автоблокировкой (инв. № 4255494); «КПП» общей площадью 28,3 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-62092); «Ангар № 2» общей площадью 439,8 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-62093); «Ангар № 3» общей площадью 545,2 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-62094), в том числе навес (инв. № 1002071); «Хозяйственно-бытовая канализационная сеть» (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018641); «Ливневая канализационная сеть» (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018644); «Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть» (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018643); «Тепловая сеть» (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-1018645); кабельные сети электроснабжения (инв. № 3000936); электротельфер (инв. № 4255331); тельфер электрический (инв. № 4255417); кран-балка (инв. № 4255501); лестница (инв. № 4255502); электротельфер (инв. № 4255530); стеллажи (инв. № 7018583); кран-балка, 14 м (инв. № 4255320) |
| Местонахождение продаваемого имущества | г. Минск, ул. Инженерная, 4Б, 4Б/1, 4Б/2, 4Б/3 |
| Сведения о земельном участке | Площадь – 0,8651 га, кадастровый номер 500000000002008803 |
| Продавец имущества | ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск |
| Организатор торгов | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| Начальная цена предмета торгов без учета НДС | 1 224 139,91 бел. руб. |
| Сумма задатка | 122 000,00 бел. руб. |
| Условия торгов | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.<br>2. Победитель торгов (покупатель) обязуется согласовать дальнейшее функциональное назначение использования объектов недвижимости с Мингорисполкомом с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 23.04.2003 года № 165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации» |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона (с условиями) на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 17 декабря 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 12.11.2018 по 13.12.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»)

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Лот 2: капитальное строение, инв. № 400/С-87058 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – здание магазина), обшей площадью 89,0 кв. м, расположенное по адресу: Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 2А

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 422087505601000080, площадью 0,0366 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 2А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохраной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0366 га

Начальная цена продажи – 3 604,50 руб. (три тысячи шестьсот четыре рубля пятьдесят копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 360 руб. (триста шестьдесят рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Лот 3: изолированное помещение, инв. № 400/D-161210 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение), площадью 378,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41-5; изолированное помещение, инв. № 400/D-161205 (назначение – помещение, не относящееся к жилищному фонду, наименование – нежилое помещение), площадью 38,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41-7; капитальное строение, инв. № 400/С-102483 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 88,55 п. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41; капитальное строение, инв. № 400/С-102484 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть), протяженностью 95,6 п. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41; капитальное строение, инв. № 400/С-102486 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопровод), протяженностью 12,35 п. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41; электрическая сеть КЛ-0,4 кВ от РУ-0,4 кВ ТП-17 до ВУ административного здания (марка кабеля ААШв 3х95), протяженностью 150 м; зеленые насаждения: ель, 7 штук

Лот № 3 расположен на земельном участке, кадастровый номер 440100000001006134, (назначение – земельный участок для обслуживания здания административно-хозяйственного назначения), площадью 0,1982, расположенном по адресу г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 41

Начальная цена продажи – 104 375 руб. (сто четыре тысячи триста семьдесят пять рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 10 437 руб. (десять тысяч четыреста тридцать семь рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка - BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 22 ноября 2018 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.06.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 19 ноября 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: комплекс зданий и сооружений рынка, расположенного по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 2, в том числе: капитальное строение, инв. № 401/С-21527 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное), площадью 122,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2 с принадлежностями: пристройка (38 кв. м), ограждение бетонное (114 кв. м), ограждение бетонное (142 кв. м), ограждение бетонное (37 кв. м), ограждение бетонное (121 кв. м), ворота металлические, калитка металлическая, площадка для мусора (9 кв. м), асфальтированная площадка (551 кв. м), навесы (2 ед. 46 кв. м), навес (45 кв. м), навес (47 кв. м), водопроводная сеть (16 п. м), электрическая сеть (18 п. м), электрическая сеть (20 п. м), ограждение из металлической сетки (27 п. м), ограждение площадки для мусора (4 м); капитальное строение, инв. № 401/С-21530 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 26,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/1; капитальное строение, инв. № 401/С-21529 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание павильона «Модуль»), площадью 173,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/2; капитальное строение, инв. № 401/С-21528 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – уборная), площадью 214,0 кв. м расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/3; зеленые насаждения

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый номер 422050400000200439, площадью 1,4383 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений рынка)

Начальная цена продажи – 70 080 руб. (семьдесят тысяч восемьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 7 008 руб. (семь тысяч восемь рублей)

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – сохранение целевого назначения выставляемого на аукцион объекта (рынок для торговли сельскохозяйственной продукции, дикорастущими плодами, ягодами и иными продовольственными и непродовольственными товарами, а также животными). Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 22 ноября 2018 г. в 15.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем, организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.08.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 19 ноября 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

# «ПАГАВАРУ З ІМІ, ПАЦАЛУЮ»

## Усё пра конны спорт: хараство і небяспека «жыцця» на канюшні

**Ганна Карасёва — самая тытулаваная айчынная спартсменка ў конным спорце, з Задыякам і Арлекінам яна выступае ў самай прыгожай, але адначасова складанай, дысцыпліне — выездцы. Ганна неаднаразова станавілася чэмпіёнкай Беларусі і выйгравала этапы Кубка свету. Гісторыя спартсменкі прыадкрыла сакрэты коннага спорту: ці складана знаходзіць агульную мову з коньмі, колькі трэба рыхтаваць жывёлу да спаборніцтваў і як абраць жарабя-пераможцу.**



### «Конь — не клюшка»

Сезон у конным спорце, у адрозненне ад іншых відаў, доўжыцца практычна круглы год, бывае такое, што ён і зусім не завяршаецца. Для нашай гераіні цяпер час падрыхтоўкі да этапу Кубка свету, які крыху менш чым праз месяц пройдзе ў Маскве. Гэта будзе заключны старт каляндарнага года, пасля якога стане зразумела, ці трапіць Ганна ў фінал Кубка свету.

— Наогул, мы ўвесь час працуем, — расказвае спартсменка. — Бо конь — гэта не клюшка, яго нельга пакінуць на адпачынак або нават на выхадныя. У нядзелю я ўсё роўна іду на канюшню, буду выводзіць коней, мы тут уждо жывём.

Прабіцца ў фінал Кубка свету для прадстаўніцы Беларусі будзе вельмі прэстыжна (туды трапляюць толькі 18 найлепшых наезнікаў свету), бо, нягледзячы на багатую гісторыю коннага спорту ў краіне, зараз гэты від у зацішшы.

— Шанцы ёсць, у двух фіналах Кубка свету я ўжо прымала ўдзел, мяркую, і ў трэці ў сваёй кар'еры траплю, — абнадзейвае Ганна. — У мінулым годзе я стала 15-й, для Беларусі гэта было вельмі прэстыжна, бо Кубак свету па ўзроўні перасягае чэмпіянат Еўропы і свету.

Акрамя гэтага турніру, наступны год стане для Ганны вельмі важным яшчэ і таму, што ён перадалімпійскі. У першыя дні студзеня 2019-га будуць абвешчаны старты, у якіх можна будзе зарабіць ачкі, каб трапіць на Алімпійскія гульні.

— Накіравацца ў Токіа камандай шанцы невялікія, але дзве асабістыя ліцэнзіі завяваць мы можам, — дзеліцца чаканнямі спартсменка. — Для нашай геаграфічнай зоны будуць арганізаваны асобныя старты, у якіх у тым ліку прымуць удзел палякі і расіяне. З коней галоўным прэтэндэнтам паехаць са мной на алімпіяду з'яўляецца Задыяк, ён у добрай форме, зараз яму дзесяць гадоў, будзе 11, гэта пік для каня. Арлекін старэйшы, таму ўжо мола ленавацца і на трэніроўках, і на спаборніцтвах.

### «Заслугі мамы нічога не значаць»

Сёння Ганна Карасёва выступае толькі ў выездцы, хоць пачынала заняткі конным спортам дзяўчына з канкура, аднак пасля першага медагляду ў вялікім спорце наезніцы забаранілі скакаць.

— Вядома, усё роўна скакала цішком, — прызнаецца Ганна. — Але пазней сканцэнтравалася толькі на выездцы. Хоць у свеце ёсць спартсмены, якія выступаюць адразу ў некалькіх дысцыплінах, — выездка вельмі складаны від коннага спорту, перш за ўсё гэта карпатлівая праца. Коні могуць удзельнічаць у праграме Вялікага прыза (алімпійскай) толькі з васьмі гадоў, гэта значыць з трох да васьмі ты проста яго выхоўваеш, — тлумачыць спартсменка. — Я думаю, таму ў выездцы большасць жанчын, яны цярпець гэтую павольную, манатонную працу.

Гераіня расказвае, што больш за ўсё для гэтай дысцыпліны падыходзяць коні нямецкіх і галандскіх парод.

— Мы часцей гаворым нават не пра пароды, а пра «бацькоў» каня. Напрыклад, калі конь бег Вялікі прыз, потым ад гэтага каня мы купляем жарабят. Усе галоўныя якасці перадаюцца па генах. Напрыклад, зараз мы ездзілі выбіраць коней у Германію, яны стаяць на прадажнай канюшні, ты ідзеш і нават мянушку жарабяці не знаходзіш, напісана толькі імя таты. Глядзіш, нейкі знакаміты, мянушку дзесяці чуў, значыць, недзе выступаў, тады просіш, каб жарабя вывелі і паказалі. А вось мянушка і заслугі мамы наогул нічога не значаць.

Працэдура выбару каня даволі цікавая: у першую чаргу жарабя выбіраюць па бацьку, потым выводзяць з дзенніка на праход, каб уважліва ацаніць яго.

— У жарабяці абавязкова павінны быць доўгія пярэднія ногі, доўгая шыя, холка вышэй за круп. Потым ужо глядзім алюр (хада каня), як ён рухаецца на волі, — адзначае Ганна і дадае, што цана на жарабя ад вядомага таты будзе стартаваць ад 20 тысяч еўра.

### «Ад каня патрэбны гены, а ад спартсмена — галава»

Поспех пары на спаборніцтвах Карасёва падзяліла б у прапорцыі 50 на 50. Спартсменка запэўнівае: якім бы вялікім ні быў спартсмен, калі ён сядзе на звычайную жывёлу, нічога не атрымаецца.

— Ад каня патрэбны гены, а ад спартсмена перш за ўсё — галава. Калі была маленькая, трэнер мне казала: «Прыйдзеш, калі табе будзе 30». Бо чалавек разумова сталее менавіта да гэтага ўзросту, — расказвае Ганна. — Зараз у мяне дзевяць коней, атрымліваецца, дзевяць трэніровак у дзень, кожная па 45—50 хвілін, вось пастаянна напрацоўваецца з гадамі, на кожным кані нешта спрабуеш, робіш, псуеш, потым выпраўляеш. Трэба накатаць свой час, навучыцца працаваць правільна. Цяжка таму, што гэта работа не толькі над сабой, а яшчэ і з жывёлай. Можна сябе прымусіць бегаць калі трэба, а тут як? Гэта жывая істота, калі штосьці баліць, ён не можа сказаць, а я яго прымушаю працаваць.

### «Яны адчуваюць мяне па кроках»

Адзін з самых важных кампанентаў поспеху ў конным спорце — знайсці агульную мову з канём. Часам гэтага зрабіць не ўдаецца, і тады жывёлу даводзіцца прадаваць. Такія выпадкі былі і ў нашай гераіні.

— Пара наезнік-конь павінна супасці. У Галандыі быў конь Тацілас, фенаменальны, чэмпіён свету і Еўропы. Галандцы прадалі яго немцам за 15 мільёнаў еўра, а нямецкі спартсмен нічога не паказаў на ім. Ён проста не змог ехаць, — кажа Ганна.

Таму наладзіць кантакт і навучыцца разумець жывёлу лепш адразу, з першых дзён знаёмства.

— У іх, як і ў людзей, ёсць настрой. Па размінцы ўжо зразумела, ці будзе сёння работа. Гэта ж жывая істота, можа, устаў не з той нагі, або месяц не ў той фазе, — усміхаецца Ганна. — А можа, у яго баліць нешта, калі ногі, відаць адразу, а бывае, што спіна. Садзішся, а ён прагінаецца, думаеш, няўжо пончык лішні з'ела, а потым сядло здымаеш, прамацваеш усю спіну — то цягліца расцягнутая, то не разагрэлася штосьці.

На канюшні Ганна кожны дзень, калі даводзіцца ад'язджаць па іншых справах, вечарам яна абавязкова вяртаецца, каб проста пацалаваць кожнага гадаванца ў носік.

— Бяру кішэню цукру і ўсіх абыходжу, свае гэта коні ці не. Яны адчуваюць мяне па кроках. Бывае, зайду на дыбачках, каб іх не трывожыць, а яны тут як тут, асабліва Арлекін: мама прыйшла. Пагавару з імі, пацалую, святло выключу і дадому.

Нягледзячы на тое, што Ганна называе коней самымі разумнымі жывёламі, яна заўважае, што праца з імі даволі траўманебяспечная. Напэўна, гэта памятаюць і аматары спорту, пару гадоў таму ў Ратамцы ў ходзе спаборніцтваў у трохбор'і загінуў спартсмен. А летась у свеце было зафіксавана каля дзесяці смерцяў, у асноўным таксама ў трохбор'і.

— Бывае, што коні б'юць заднімі нагамі, — расказвае Ганна. — Мяне таксама ў мінулым годзе ўдарыў: у выніку — парваная цягліца на назе. Гэта жывая істота, якая важыць 500 кілаграмаў, што ў яе ў галаве — ніхто не ведае. Такі ў мяне Арлекін, у яго свавольны характар з самага дзяцінства. Калі б ён трапіўся мне такі цяпер, не ўзялася б за гэтага каня, але тады выбару не было. Многія мне казалі: кінь, ты на ім заб'ешся, а я паўтарала, што гэта мой конь, на якім заваюю многае. У выніку Арлекін мяне і вывеў на сусветную арэну, на ім я атрымала званне майстра спорту міжнароднага класа і маё прозвішча асацыюецца менавіта з гэтым канём.



### «Галаўны ўбор за тры тысячы еўра»

Акрамя цяперашніх дзевяці коней, хутка ў канюшню Ганны дадасца яшчэ восем маладых. Спартсменка стараецца даглядаць іх сама, хоць вялікая частка працы прыпадае і на конегадоўцаў.

— У мяне няма спецыяльнай ветэрынарнай адукацыі, але я бачу, калі з канём штосьці не так. У мяне ёсць цэлая куча ўсякіх мазяў. Для капытоў — зімовыя, летнія; уціркі — астуджальныя, саграваньныя, рэлаксавальныя. Ёсць усё для прыгажосці коней: спецыяльныя шампуні, спрэі для хваста, спрэі з пахамі, як туалетныя воды. Стрыжом коней, нават цалкам голім, таму што, калі шэрсць абрастае, яны моцна пацеюць. Раз на месяц абавязкова падкоўваем, — расказвае суразмоўніца.

У выездцы вельмі важным з'яўляецца не толькі знешні выгляд каня, але і знешнасць наезніка. Апранута спартсмену проста, але не вельмі танна.

— Думаю, любому суддзі прыемна ўбачыць, калі выязджае наезнік на кані, які блішчыць, а спартсмен апрануты з іголачкі, бо конны спорт — гэта спорт каралёў, — заўважае Ганна. — Ёсць спецыялізаваная англійская фірма, якая шые цыліндры, адзін галаўны ўбор каштуе тры тысячы еўра. Праўда, мы пакуль да такога не дараслі. Я часцей за ўсё купляю адзенне нямецкіх фірмаў, фрак — каля 800 еўра, боты — 1000, цыліндр — 300—400, брыджы — 200, пальчаткі — 50, шпоры — 50, увогуле ў тысячы дзве еўра ўкласціся можна.

### «Нараджаць паехала з канюшні»

За сваю спартыўную кар'еру Ганна Карасёва двойчы хадзіла ў дэкрэт, але доўжыўся гэты водпуск лічаныя месяцы.

— На чацвёртым месяцы цяжарнасці я яшчэ выступала на спаборніцтвах, потым ужо злезла з каня, нарадзіла і праз тры тыдні села зноў. Паехала на спаборніцтвы ва Украіну і адразу выйграла там турнір, — натхнёна кажа гераіня. — Вяртанне давалася мне лёгка, можа быць таму, што было такое вялізнае жаданне выступаць, я ж увесь час на канюшні і нараджаць паехала адсюль. Неяк цяжарнай нават зваліласся з каня, не памятаю, які быў месяц, але ўсё абышлося, устала і паехала далей.

Не дзіўна, што і дочкі Ганны выраслі на канюшні, старэйшая плануе пайсці па слядах мамы, сёння ў яе ўжо ёсць уласны поні, на ім яна трэніруецца і выступае на спаборніцтвах.

— Яны тут з часоў, калі былі яшчэ ў калясках, старэйшая — проста фанат коней. Падымаецца ў шэсць раніцы: «Мама, на канюшню!» Раней яна ездзіла на Задыяку, але ён у мяне вялікі, шукала ёй поні і вось нядаўна зрабіла сюрпрыз — купіла. Праўда, ён ужо скідваў яе пару разоў. Аднойчы дачка вельмі напалохалася, потым баялася сесці на яго, але неяк перамагла сябе, села, навучылася быць трохі нахабнейшай, і цяпер яны найлепшыя сябры. Я толькі падтрымліваю яе захапленне, адзінае, яна хоча скакаць, ёй не падабаецца выездка, і мяне гэта, вядома, палохае.




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# «Гуляла з дзядулем на шакаладкі»

## Як беларуска стала найлепшай на кантыненце ў рускіх шашках

**Вера ХВАШЧЫНСКАЯ пачала выступаць у дарослых турнірах па шашках у 15-гадовым узросце. Першыя турніры не прыносілі ёй высокіх вынікаў, але дзяўчына ішла да сваіх мэт паэтапна, крок за крокам. Летась яна стала прызёрам чэмпіянату Еўропы на маладзёжным першынстве, а сёлета заваявала «золата» ўжо на дарослым узроўні, аўтаматычна атрымаўшы званне міжнароднага гросмайстра. Пра тое, як трапіла ў гэты від спорту, сусветных лідараў і правілы правядзення спаборніцтваў Вера расказала ў адным са сваіх рэдкіх інтэрв'ю.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

***— Вера, рыхтуючыся да інтэрв'ю, я знайшла ваша прозвішча ў «Вікіпедыі»...***

— Здорава, я не ведала, што ёсць там. Наогул, ніколі не думала, што траплю ў «Вікіпедыю», і мэт такіх у мяне не было, я проста займаюся тым, што мне падабаецца. Да гэтага часу лічу, што шашкі для мяне больш хобі, хоць займаюся імі на прафесійнай аснове.

***— Якое званне самае высокае ў вашым відзе спорту?***

— Міжнародны гросмайстар. Гэта званне прысвоілі мне аўтаматычна, калі я выйграла цяперашні чэмпіянат Еўропы. У фінале абыграла шматразовую чэмпіёнку свету і Еўропы Алену Скавіціну з Малдовы. Раней мы сустракаліся на камандных чэмпіянатах, але звычайна ў нас была нічыя ці я прайгравала, а тут упершыню атрымала перамогу. Прыемна, але на самай справе мне проста пашанцавала.

***— Што значыць для вас званне міжнароднага гросмайстра і якія бонусы яно дае?***

— Зноў жа мэты атрымаць яго перад сабой не ставіла, мне проста падабаецца гуляць і выйграваць, а гросмайстар — гэта прыемнае дапаўненне. Асабіста для мяне яно нічога не значыць, проста прыемна. Зараз галоўнае — гуляць на гэтага гросмайстра, паказваць якасць гульні і рабіць так, каб твой узровень сапраўды адпавядаў гросмайстарскаму. Што датычыцца бонусаў, на жаль, іх няма.

***— Апроч іншага, вы ўладальніца мноства еўрапейскіх тытулаў...***

— На юнацкім узроўні ў мяне іх дастаткова, а вось на дарослым жаночым я ні разу не трапляла ў тройку ў «класіцы», хоць была на п'едэстале ў бліцы і хуткіх шашках. Усё ж такі, мне здаецца, класічная праграма заўсёды лічыцца больш прэстыжнай. Калі казаць пра розніцу паміж маладзёжным і дарослым узроўнямі, то яна, вядома, каласальная. Сярод дарослых гуляць нашмат складаней, хоць усе, хто выступае на маладзёжных турнірах да 26 гадоў, паспяхова ўдзельнічаюць і ў дарослых спаборніцтвах. У многіх відах спорту ўзроставы пераход не праходзіць гладка, гэтаксама было і ў мяне: першыя часы ў дарослых жаночых турнірах не атрымлівалася, і толькі пару гадоў таму я пачала займаць прызавыя месцы.

***— З якога ўзросту вы сталі выступаць сярод дарослых?***

— У гадоў 15—16, гэта нармальная практыка. На чэмпіянаце Беларусі сярод жанчын удзельнічаюць дзяўчаты, якім 12—13 гадоў. Наогул, трэба сказаць, што ў шашках няма ўзроставага абмежавання.

***— Што можна сказаць аб сусветных лідарах і якое месца сярод іх займае наша краіна?***

— Беларусь досыць вядомая ў шашках і, несумненна, з'яўляецца адным з лідараў у свеце. У нас шмат чэмпіёнаў і сярод моладзі, і сярод дарослых. Відаць, засталіся добрыя традыцыі з часоў Савецкага Саюза, добрыя настаўнікі, моцная школа.

Таксама на лідарскіх месцах у свеце сёння спартсмены з Расіі, Украіны, Малдовы. Наогул, многія цяпер гуляюць добра, на чэмпіянаце Еўропы было прадстаўлена 10 краін у жаночым турніры, на чэмпіянаце свету іх больш — 14—15.

***— Раскажыце, як звычайна праходзіць ваш трэніровачны дзень?***

— Рашаю камбінацыі, паўтараю або вучу дэбюты, часам гуляю з трэнерам, разбіраем нейкія пазіцыі. Што датычыцца колькасці трэніровак, то яна залежыць ад таго, ці рыхтуюся я да якога-небудзь турніру.

***— Якія якасці, на ваш погляд, развіваюць шашкі?***

— Перш за ўсё, вучаць разлічваць на некалькі хадоў наперад, ну і, як любы спорт, вучаць правільна ставіцца да паражэнняў.

***— Апошнім навыкам вы таксама ўжо авалодалі?***

— Больш памятаю, вядома, паражэнні, чым перамогі. Раней, калі была маленькая, вельмі моцна перажывала з-за іх, нават плакала. Зараз стараюся не засяроджвацца на паражэнні і проста ісці далей. Асабліва калі гэта адбываецца падчас турніру. Трэба сабрацца і гуляць далей, таму што паражэнне часам можа нічога не значыць, пасля яго ў рэшце рэшт можна выбіцца ў лідары. Трэба паспрабаваць адпусціць пройгрыш і думаць пра наступную партыю. Наогул, зараз я стараюся працей ставіцца і да паражэнняў, і да перамог.

***— Супраць мужчын гуляеце?***

— Не, не выпадала. Але ведаю, што некаторыя дзяўчаты гуляюць, гэта добра павышае ўзровень. У іх адрозніваецца стыль гульні, яны па-іншаму вядуць партыі, мне здаецца, мужчыны больш прафесійна ставяцца да таго, што адбываецца на дошцы, і да турніраў у цэлым. А жанчыны больш схільныя да эмоцый.

***— Як людзі, далёкія ад спорту, рэагуюць на тое, што вы займаецеся шашкамі?***

— Здзіўляюцца. Шашкі? Гэта ўвогуле спорт? Асабліва калі кажаш, што ў нас ёсць спаборніцтвы, турніры. Людзі лічаць, што гэта проста настольная гульня, расставілі шашкі ўвечары, згулялі. Многія ставяцца да гэтага несур'ёзна. Раней было не вельмі прыемна, а цяпер ужо не звяртаю на гэта ўвагі.

***— Здаецца, што ўсе шашысты і шахматысты добра вучацца ў школе...***

— Не ведаю, як астатнія, але ў мяне заўсёды былі праблемы з матэматыкай. Цягнула больш да такіх прадметаў, як гісторыя, грамадазнаўства. Не тое каб я адставала, але выдатніцай дакладна ў школе не была. Напэўна, усё ж такі гэта памылковае меркаванне.

***— Калі глядзець за гульнёй шашыстаў збоку, здаецца, вы вельмі спакойныя людзі...***

— Напэўна, гэта толькі з боку. Я таксама сканцэнтраваная за партыяй, але ў жыцці часта магу праявіць эмоцыі. На турнірах мы абмежаваныя яшчэ і пэўнымі правіламі. Напрыклад, падчас партыі нельга ні з кім размаўляць, акрамя саперніка. За гэта можна атрымаць заўвагу. Падчас ходу свайго апанента можна ўстаць, прагуляцца, перакусіць, папіць вады, але не падыходзіць блізка да іншых гульцоў, якія вядуць свае партыі.

***— Наогул, як вы пачалі займацца гэтым відам спорту?***

— У другім класе мама вырашыла адвесці мяне на які-небудзь гурток, так атрымалася, што ў школе ў нас былі шахматы і шашкі, вось так я прыйшла і засталася. Адразу вельмі спадабалася. Праз год у мяне ўжо былі першыя спаборніцтвы, нейкі камандны турнір, і я там прайграла вельмі шмат партый, моцна знервавалася. Родныя заўсёды падтрымлівалі мяне, хвараюць за мяне і цяпер, перажываюць. А наогул, першапачаткова мяне пабудзіла навучыў гуляць, мы з ім перыядычна гулялі на нейкія шакаладкі, цукеркі.

***— У іншыя настольныя гульні гуляеце?***

— Не, наогул не ўмею ні ў што больш гуляць, нават у шахматы не ўмею, уяўляеце? *(Смяецца.)*

***— Якія мэты перад сабой вы ставіце цяпер?***

— Павышаць свой узровень і атрымліваць больш задавальнення ад самой гульні.

*г. Бабруйск.*

# Важныя пункты

**Фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» і ўстанова «Інфармацыйна-турысцкі цэнтр «Мінск» падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы сумеснай арганізацыі работы гарадскіх інфармацыйных пунктаў, паведамляе афіцыйны сайт Гульняў minsk2019.by.**

Каб стварыць спрыяльнае інфармацыйнае асяроддзе для гасцей Гульняў, у перыяд правядзення мерапрыемства ў Мінску будзе арганізавана работа 20 гарадскіх інфармацыйных пунктаў. Яны размесцяцца на самых важнейшых транспартных аб'ектах. Сярод іх Нацыянальны аэрапорт Мінск, аўтавакзал «Цэнтральны», чыгуначны вакзал станцыі Мінск-Пасажырскі. Акрамя таго, інфармацыйныя пункты будуць размяшчацца побач з усімі спартыўнымі аб'ектамі форуму і ў ключавых пунктах асноўных турысцкіх маршрутаў сталіцы.

Каля 300 валанцёраў II Еўрапейскіх гульняў будуць забяспечваць работу гарадскіх інфармацыйных пунктаў і даваць звесткі, у тым ліку на замежных мовах, аб праграме мультыспартыўнай падзеі, маршрутах грамадскага транспарту, турысцка-рэкрэацыйным патэнцыяле Мінска і Беларусі.

Бакі дамовіліся аб супрацоўніцтве ў сферы распрацоўкі і вырабу тэматычнай друкаванай прадукцыі, якая будзе распаўсюджвацца ў гарадскіх інфармацыйных пунктах, а таксама ў галіне прасоўвання II Еўрапейскіх гульняў на галоўных міжнародных турысцкіх выстаўках.

Нагадаем, работа інфармацыйных пунктаў была пратэсціравана ў верасні 2018 года падчас правядзення ў Мінску Дзён нацыянальнай культуры Грузіі, Ізраіля, Малдовы і Азербайджана.

■ Экспрэс-навіны

## Пробы будуць пераправяраць

### Міжнародны алімпійскі камітэт праводзіць паўторны аналіз проб, узятых на Гульнях 2012 года ў Лондане

**Праграма, у якой выкарыстоўваюцца найноўшыя навуковыя метады аналізу, накіравана на тэсціраванне проб на ўсе рэчывы, забароненыя ў 2012 годзе. Калі неспрыяльны вынік аналізаў будзе пацверджаны для любога з паўторна прааналізаваных узораў з Лондана-2012, спартсмена праінфармуюць адпаведным чынам, пасля чаго ў дачыненні да яго можа пачацца разбор.**

Паколькі міжнароднае агенцтва па тэсціраванні (ITA) дзейнічае ў цяперашні час, МАК накіроўвае аналізы ў ITA, якое разглядае ўсе вынікі аналізаў і паведамляе спартсменам, чые пробы былі разгледжаны. У выпадку выяўлення факту парушэння правілаў спартсменам даецца выбар: быць заслуханым спартыўным арбітражным судом ці дысцыплінарнай камісіяй МАК. Антыдопінгавыя правілы для Алімпійскіх гульняў у Лондане 2012 такія, што яны ўжываюцца і пасля правядзення паўторных аналізаў, таму МАК таксама накіроўвае аналізы ў ITA для паўторнага аналізу.

Да правядзення Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра 2016 года, а таксама ў рамках расследавання сістэматычных маніпуляцый антыдопінгавай сістэмай у Расіі было праведзена больш за 500 паўторных аналізаў спартсменаў, якія выступалі на Алімпійскіх гульнях у Лондане 2012 года, у выніку чаго было выяўлена 48 парушэнняў антыдопінгавых правілаў. Паўторныя аналізы былі праведзены для выяўлення анаболікаў з дапамогай новай сістэмы «доўгатэрміновага выпрабавання метабалізму».

Праграма паўторных аналізаў узораў з Алімпійскіх гульняў 2012 года ў Лондане будзе працягнутая ў 2019 годзе да заканчэння тэрміну даўнасці да 2020 года.

Гэта частка мер МАК па абароне добрасумленных спартсменаў і сумленнасці спаборніцтваў. МАК захоўвае ўзоры з Алімпійскіх гульняў у Афінах 2004 года і сістэматычна іх аналізуе.

## Клімат уплывае на Алімпіяду

**Кіраўнік Алімпійскага камітэта Томас Бах лічыць, што колькасць краін, якія хочуць прэтэндаваць на права правядзення зімовых Алімпійскіх гульняў, памяншаецца з-за змены клімату. Пра гэта ён расказаў падчас інтэрактыўнай сесіі на пятым саміце «Разумныя гарады і спорт».**

«Важна адзначыць розніцу паміж зімовай і летняй Алімпіядай. Зімовыя Гульні — гэта выклік па многіх прычынах. Геаграфія абмяжоўвае колькасць краін, якія могуць прэтэндаваць на зімовую Алімпіяду. Плавальны басейн можна пабудаваць дзе заўгодна, але знайсці горы для правядзення спаборніцтваў па горных лыжах ужо складаней.

Акрамя таго, зараз мы маем справу са змяненнем клімату, у прыватнасці ў Еўропе, таму лік магчымых кандыдатаў памяншаецца яшчэ больш.

У многіх рэгіёнах адбываецца змяненне клімату, і людзі кажуць, што сэнсу інвеставаць у развіццё зімовых відаў спорту няма, паколькі праз дзесяць гадоў укладанні могуць не акупіцца з-за адсутнасці натуральнага снегу і неабходнасці выкарыстоўваць снег штучны», — сказаў Бах.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «NGK – УДАЧНАЯ ПОКУПКА»

Настоящие правила Рекламной игры «NGK – Удачная покупка» (далее – Правила), целью проведения которой является увеличение объема реализации товаров брендов NGK|NTK или их групп на территории проведения Рекламной игры, разработаны в соответствии с Положением о проведении Рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения Рекламной игры «NGK – Удачная покупка» (далее – Рекламная игра).

**Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является Торговое унитарное предприятие «Пропеллер Медиа», УНП 391811829, зарегистрированное администрацией Октябрьского района г. Витебска от 17 февраля 2017 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 391811829 (далее – Организатор). Юридически адрес Организатора: Республика Беларусь 210038, г. Витебск, пр-т Московский, 55Л/3, контактный телефон +375212642244.

**Заинтересованное лицо Рекламной игры.**

Заинтересованным лицом Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «НГК Спарк Плагс (Евразия)», 119530, Российская Федерация, г. Москва, Очаковское шоссе, д. 34, 5-й этаж, помещение IX, ИНН 7729740239, КПП 772901001.

**Сайт.**

Интернет-ресурс, размещенный под доменным именем ngk.armtek.by.

**Участники Рекламной игры.**

Участник Рекламной игры – физическое лицо, совершившее покупку товара брендов NGK|NTK на территории проведения Рекламной игры в торговой сети магазинов ООО «Еврозапчасть» в период с 12 ноября 2018 года по 9 декабря 2018 года исключительно для личных нужд, не связанных с осуществлением предпринимательской деятельности, отвечающее требованиям правил проведения Рекламной игры и выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных настоящими Правилами проведения Рекламной игры (далее – Участник).

Участником не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором рекламной игры, с Заказчиком рекламной игры, с ООО «Еврозапчасть», супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

**Розыгрыш.**

Розыгрыш призов Рекламной игры, проходящий в установленную дату и время, в соответствии с Правилами Рекламной игры.

**Игровой номер.**

Это числовое значение, состоящее из двух частей, которое присваивается Участнику при соблюдении Правил участия в Рекламной игре, печатается на карточках и размещается в лототрон для участия в Розыгрыше призов.

**1. Название Рекламной игры:** «NGK – Удачная покупка».

**2. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь. Торговая сеть магазинов автозапчастей «ARMTEK» ООО «Еврозапчасть».

**3. Дата начала Рекламной игры:** 12.11.2018.

**4. Дата окончания Рекламной игры:** 31.12.2018.

**5. Товары, с целью стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** свечи зажигания брендов NGK|NTK, свечи накаливания брендов NGK|NTK, катушки зажигания брендов NGK|NTK, кислородные датчики брендов NGK|NTK, провода зажигания брендов NGK|NTK, свечные наконечники брендов NGK|NTK и температурные датчики брендов NGK|NTK (далее – Группа товаров NGK|NTK).

**6. Порядок участия в розыгрышах призов.**

6.1. Для участия в Рекламной игре Участнику необходимо в период с 12 ноября 2018 г. по 9 декабря 2018 года включительно:

В один из следующих этапов:

Этап 1: с 12.11.2018 (00:00) по 18.11.2018 (23:59:59)
Этап 2: с 19.11.2018 (00:00) по 25.11.2018 (23:59:59)
Этап 3: с 26.11.2018 (00:00) по 02.12.2018 (23:59:59)
Этап 4: с 03.12.2018 (00:00) по 09.12.2018 (23:59:59)

6.1.1. Осуществить покупку любого товара из Группы товаров NGK|NTK на территории Республики Беларусь в торговой сети магазинов ООО «Еврозапчасть».

6.1.2. Получить идентификационный номер Участника.

Идентификационный номер Участника присваивается с первого разряда (01, 02, 03 и т. д.).

Ввести регистрационные данные Участника в форму раздела «Регистрация» на Сайте:

- Фамилия;
- Имя;
- Отчество;
- Номер телефона;
- E-mail;
- Пароль;
- Подтверждение пароля.

Каждому участнику, который впервые совершил действия, указанные в пункте 6.1.2. настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного идентификационный номер на дату и время регистрации на сайте. Для регистрации новых покупок повторный ввод данных в разделе «Регистрация» на Сайте не требуется.

6.1.3. Авторизоваться на Сайте, указав логин и пароль.

6.1.4. Получить Игровой код Участника.

Указать следующие регистрационные данные в форме раздела «Регистрация покупки на розыгрыш»:

- В поле «Место покупки» выбрать из предложенного списка значений адрес магазина автозапчастей, принадлежащего торговой сети ООО «Еврозапчасть», в котором Участник осуществил покупку.
- В поле «Дата покупки» указать дату из чека об оплате.
- В поле «Номер чека» указать номер товарного чека или номер платежа в ЕРИП по номеру заказа;

После завершения регистрации, Покупке присваивается порядковый номер по дате и времени регистрации Покупки на Сайте.

Порядковые номера присваиваются с первого разряда (000001, 000002, 000003 и т. д.).

При регистрации новой Покупки, согласно процедуре, описанной в пункте 6.1.4. настоящих Правил, ей присваивается следующий после последнего присвоенного порядковый номер на дату и время регистрации на сайте.

При успешной регистрации Покупки Участнику присваивается Игровой номер, дающий право на участие в Розыгрыше призов этапа, в период прохождения которого он был получен.

Игровой номер состоит из двух частей вида 000001-000001, где первая часть – порядковый номер, полученный при успешной регистрации Покупки на дату и время регистрации, а вторая часть – идентификационный номер Участника, полученный при регистрации на Сайте на дату и время регистрации.

С момента успешной регистрации Покупки в течение двух часов, Участнику автоматически высылается уведомление на адрес электронной почты, указанный Участником при регистрации на Сайте.

Успешно зарегистрированные Игровые номера по дате и времени регистрации на Сайте, а также результаты проведения Розыгрышей, в которых они принимают участие, Участник может отслеживать в личном кабинете Сайта в разделе «Персональные игровые коды участника».

Данные из одного заказа могут быть успешно зарегистрированы на Сайте только один раз. В случае попытки регистрации Участником данных одной и той же Покупки дважды, повторно внесенные данные не будут приниматься к участию в Рекламной игре.

Количество Покупок, которые может зарегистрировать один Участник, как и количество Игровых номеров, участвующих в Розыгрышах Призов не ограничено, при условии соблюдения всех подпунктов, указанных в п. 6 настоящих Правил.

К участию в Рекламной игре не принимаются:

- Покупки, совершенные ранее 12 ноября 2018 года 00:00:00 и позднее 9 декабря 2018 года 23:59:59;
- Покупки, совершенные не на Территории проведения Рекламной игры;
- Покупки, совершенные не в магазинах торговой сети ООО «Еврозапчасть»;
